Так прыхільнікам тэорыі "натуральнага права" быў расійскі гісторык і дзяржаўны дзеяч В.Тацішчаў, адначасова ён быў прыхільнікам самаўладдзя і лічыў, што гэта форма дзяржаўнага кіраўніцтва неабходна для такой краіны, як Расія. Прычым выступаў за пэўнае абмежаванне ўлады цара прадстаўнічымі шляхецкімі ўстановамі.

А.Радзішчаў сцвярджаў, што адзіным сродкам знішчэння прыгону можа быць народная рэвалюцыя, якая прывядзе да распаду імперыі на часткі. Пазней яны аб'яднаюцца ў дабраахвотны саюз рэспублік, дзе ўлада будзе рэалізоўвацца народнымі выбраннікамі.

М.Сперанскі вялікую ўвагу надаваў падзелу ўладаў: заканадаўчы орган – Дзяржаўная дума, выканаўчая ўлада – імператар і трэцяя ўлада – вышэйшы судовы орган.

У канстытуцыйных праектах дзекабрыстаў М.Мураўёва і П.Песцеля ўтрымлівалася неабходнасць забеспячэння адказнасці ўрада перад народам, увядзенне ў Расіі дэмакратычных правоў і свабод.

У XIX ст. шляхі і характар развіцця дзяржаўнага і эканамічнага ладу Расіі вызначаліся ў спрэчках "заходнікаў" і "славянафілаў".

Заходнікі (П.Аненкаў, Т.Граноўскі, К.Кавелін, П.Чаадаеў, Б.Чычэрын) выступалі за заходнееўрапейскія каштоўнасці, у прыватнасці за парламентарызм і канстытуцыйныя парадкі Англіі і Францыі. Славянафілы (К.Аксакаў, І.Кірэяўскі, А.Хамякоў і інш.) абгрунтоўвалі асаблівасць Расіі на базе духоўнасці, маралі, калектывізму, праваслаўя і г.д., што прывядзе да стварэння сусветнай цывілізацыі, ядром якой будзе Расія.

Рэвалюцыйныя дэмакраты А.Герцан, М.Агароў, В.Бялінскі, М.Чарнышэўскі бачылі галоўную сілу гістарычнага развіцця ў народзе і таму патрабавалі народаўладдзя. А.Герцан замест буржуазна-дэмакратычных форм кіравання прапаноўваў утварэнне "сацыяльнай рэспублікі", дзяржаўная ўлада ў якой павінна быць дэцэнтралізавана і ўвасабляцца ў асноўным у межах абшчын. Выступаў за рэвалюцыю і рэвалюцыйную дыктатуру, але ў шчыльнай сувязі з эканамічнымі пераўтварэннямі і маральным выхаваннем асобы.

А.Герцан і М.Чарнышэўскі паклалі пачатак "народніцтву". Ідэолагі гэтага руху М.Бакунін, П.Лаўроў, П.Ткачоў былі прыхільнікамі сялянскай рэвалюцыі і абшчыннага сацыялізму. М.Бакунін таксама адмаўляў дзяржаву ў любых яе формах і на яе месцы бачыў "свабодную федэрацыю" земляробчых і фабрычна-рамесніцкіх асацыяцый.

Напрыканцы XIX – пачатку XX стст. пачынае сваю дзейнасць У.Ленін, які быў палкім прыхільнікам пралетарскай рэвалюцыі, у выніку якой будзе ўсталявана дыктатура пралетарыяту і пабудавана сацыялістычнае, а затым камуністычнае грамадства. Вялікую ўвагу надаваў ролі рэвалюцыйнай партыі ў мабілізацыі рабочага класа на рэвалюцыйную барацьбу. Ленін разглядаў палітыку з пазіцыі ўзаемаадносін нацый і адносін паміж класамі. Класы – гэта аснова палітыкі і вызначаюць яе змест. Ленін развіў тэорыю Маркса аб

сацыялістычнай рэвалюцыі, вылучыў тэорыю аб магчымасці перамогі сацыялістычнай рэвалюцыі ў адной асобнай краіне.

### 5. Асноўныя тэндэнцыі развіцця сучаснай паліталогіі

Як самастойная галіна даследаванняў і асобная навука паліталогія сфарміравалася на рубяжы XIX – XX стст. Менавта ў гэты час з агульнай масы даследчыкаў вылучаецца шэраг мысліцеляў, якія ў цэнтр увагі ставяць вывучэнне палітычных адносін і спрабуюць разглядаць рашэнне іншых грамадскіх праблем праз палітычную ўладу. Асноўныя праблемы паліталогіі як самастойнай навукі, удакладненне яе катэгарыйнага апарату сфармуляваны ў канцэпцыях Г.Моска, В.Парэта, М.Вэбера, Р.Міхельса, А.Бэнтлі, М.Астрагорскага, М.Кавалеўскага і інш. Яны разглядалі ў сваіх працах такія актуальныя праблемы, як структура палітычнай улады, механізм і ўмовы яе функцыяніравання, паказалі ролю палітычных партый, лідараў, дзяржавы; удакладнілі паняційны апарат; распрацавалі метадалогію і г.д.

Па сёняшні дзень папулярна ***"тэорыя эліт"***. Першую спробу выкласці тэорыю эліт зрабіў італьянец Гаэтано Моска ў працы "Элементы палітычнай навукі". На думку Моска, улада ў грамадстве заўжды знаходзілася і павінна быць у руках невялічкай групы людзей – меншасці. Правячую меншасць ён называў пануючым класам або элітай. Сваё кіраванне эліта ўвасабляе шляхам распаўсюджвання ў грамадстве пэўнай ідэалогіі. Далейшае развіццё тэорыя эліт трымала ў працах Вільфрэда Парэта, які вылучыў канцэпцыю цыркуляцыі (змены) эліт.

Дзейнасць палітычных партый, іх месца і ролю ў функцыяніраванні заходняй дэмакратыі аналізаваў адным з першых М.Астрагорскі. Ён прыйшоў да высновы, што іх утварэнне з'явілася наступствам рэалізацыі дэмакратычных тэндэнцый у грамадстве.

Вялікі ўплыў на фарміраванне і развіццё паліталогіі аказалі погляды нямецкага сацыёлага і эканаміста М.Вэбера, асабліва кніга "Эканоміка і грамадства". Цэнтральным паняццем у яго з'яўляецца "панаванне", якое ён адрознівае ад улады, заснаванай на эканамічнай моцы. Не адмаўляючы ролю гвалту як асновы дзяржавы, Вэбер лічыць неабходным існаванне наяўнасці пэўных каштоўнасцей, на якіх грунтуецца падпарадкаванне. Вэбер вылучыў тры тыпа панавання: традыцыйнае (вера падданых у тое, што ўлада законна, г.зн. існавала заўжды), харызматычнае (вера ў асаблівыя якасці асоб), рацыянальнае (панаванне права). Шмат увагі надаваў Вэбер і праблеме палітычнага лідарства.

Пачатак аналізу палітычных паводзін асобных груп і асоб з дапамогаю эмпірічных метадаў заклаў Артур Бэнтлі. У кнізе "Працэс кіравання" ён сцвярджае, што дзейнасць людзей прадвызначана іх інтарэсамі і накіравана на забеспячэнне гэтых інтарэсаў. Прычым дзейнасць людзей увасабляецца не асобна, а пры дапамозе груп, у якіх яны аб'яднаны на грунце агульных інтарэсаў. Бэнтлі разглядае працэс кіравання як барацьбу паміж інтарэсамі розных груп, а дзяржаву як рэгулятар у гэтай барацьбе.

Асноўнымі праблемамі, якія разглядае сучасная заходняя паліталогія, з'яўляюцца:

а) механізм фарміравання палітычнай улады і яе ўплыў на працэс прыняцця палітычных рашэнняў;

б) паводзіны сацыяльных груп і асобных грамадзян пад час выбарчых кампаній;

в) працэс фарміравання палітычных мэтаў і грамадскай думкі;

г) механізм фарміравання і функцыяніравання палітычных партый і грамадска-палітычных арганізацый;

д) дзейнасць дзяржавы і праблема бюракратыі;

е) сутнасць функцыі і фарміраванне палітычнай культуры і іншыя.

У XX ст. паліталогія як навука атрымлівае значнае развіццё ў ЗША. Асаблівую ўвагу амерыканскія палітолагі надаюць уплыву псіхалагічных матываў паводзін асобных людзей і сацыяльных груп на палітычныя працэсы ў грамадстве. У выніку быў сфарміраваны ***біхевіярысцкі*** накірунак ў паліталогіі (заснавальнікі – група вучоных з Чыкагскага ўніверсітета на чале з Ч.Мерыамам). Мэта біхевіярызма ў палітычнай навуцы – імкненне вывесці структуру ўладных адносін з прыроды чалавека, якую магчыма даследаваць навуковымі метадамі. Задача палітычнай тэорыі – патлумачыць з'явы палітычнага жыцця з натуральных уласцівасцей чалавека, вывесці палітычныя феномены з заканамернасцей натуральных жыццёвых паводзін людзей.

У пачатку 1960-х гг., у ЗША, была сфармуліравана канцэпцыя ***"палітычнай культуры"***. Яе стваральнікі Г.Алмонд і С.Верба. Яны вылучылі тры чыстыя тыпы культуры: патрыярхальная, падданіцкая, актывісцкая, а з іх спалучэння яшчэ тры змешаныя тыпы. У кожнай грамадска-палітычнай сістэме і кожнай краіне існуе асаблівая палітычная культура, якая вызначае палітычныя паводзіны, якім надае той ці іншы змест і накірунак.

Амерыканскі палітолаг Г. Ласуэл сфармуляраваў тэорыю палітычнага псіхааналізу – адносіны індывіда да палітыкі тлумачацца псіхалагічным механізмам яго асобы. Ласуэл распрацаваў тыпалогію палітычных асоб, вылучыў тры тыпы палітыкаў: адміністратар, агітатар і тэарэтык.

Канцэпцыя ***"нацыянальных інтэрэсаў"*** знайшла сваё адлюстраванне ў даследаванні "Палітыка ў XX ст." амерыканскага палітолага Ганса Маргентау, які пераасэнсаваў уяўленні аб міжнародных адносінах і прыродзе ўлады. Вышэйшым крытэрыем нацыянальных інтарэсаў буйнай дзяржавы з'яўляецца дасягненне рэгіянальнай або сусветнай гегемоніі. Такая палітыка павінна быць падмацавана сілаю, якая з'яўляецца, на думку Маргентау, вызначальнай рысай дзяржавы, унутранне ўласціва ёй.

Асаблівасцю французскай паліталогіі з'яўляецца развіццё ***тэорыі інстытутаў***. Згодна гэтай тэорыі палітыка ўяўляе з сябе вынік дзейнасці розных палітычных інстытутаў (дзяржавы, палітычных партый, прафсаюзаў і інш. арганізацый). Такім чынам, паліталогія займаецца вывучэннем шматлікіх інстытутаў, якія дзейнічаюць у даным грамадстве.

***Палітычныя партыі*** – адна з галоўных праблем італьянскай паліталогіі. Асаблівае значэнне маюць працы Дж.Сарторы. Ён, зыходзячы з

таго, што партыя – галоўны пасрэднік паміж грамадствам і ўрадам, даследаваў партыйныя сістэмы. Стварыў тыпалогію партыйных сістэм (двух і шматпартыйныя з дэтальнай іх класіфікацыяй), ахарактарызаваў шматпартыйную сістэму крайняга плюралізму (да фарміравання ўраду магчымы доступ толькі для партый цэнтру).

Нямецкі палітолаг Ральф Дарэндорф з'яўляецца адным з асноўных прадстаўнікоў ***тэорыі сацыяльнага канфлікту***. На яго думку кожная група людзей любога грамадства выступае як носьбіт пэўных пазіцый. Прычым кожная пазіцыя злучана з выкананнем пэўнай сацыяльнай ролі. Сацыяльная роля – гэта сукупнасць спосабаў паводзін людзей, якія дадзены носьбіту пазіцыі ў пэўным грамадстве. Ці інакш – гэта прымушэнне, з дапамогаю сістэмы сацыяльных санкцый, кожнага канкрэтнага чалавека паводзіць сябе пэўным чынам. Прымусовы характар паводзін з'яўляецца важнай прыкметай сацыяльных груп. Згодна норм чалавек мае магчымасці да пасоўвання на больш высокія пазіцыі, адсюль узнікненне панавання, а наяўнасць панавання і падпарадкавання вядзе да канфлікту. Зыходзячы з прыроды і сутнасці канфлікта Дарэндорф вызначае канфліктуючыя сацыяльныя групы, асноўная прыкмета якіх – удзел у панаванні ці выключэнне з яго.

Такім чынам, сучасная заходняя паліталогія не ўяўляе з сябе адзінай тэорыі. Пераважная большасць заходніх паліталагічных тэорый аформлена ў выглядзе пэўных школ, накірункаў і канцэпцый. Прычым гэтыя накірункі і канцэпцыі не замкнутыя межамі адной краіны, а развіваюцца палітолагамі розных краін. Паліталогія знаходзіцца на сённяшні дзень у залежнасці ад запатрабаванняў палітыкі, якая праводзіцца у той ці іншай дзяржаве.

## ЛЕКЦЫЯ 3. ПАЛІТЫЧНАЯ ЎЛАДА І МЕХАНІЗМЫ ЯЕ ЗДЗЯЙСНЕННЯ

1. Сутнасць, крыніцы і асаблівасці палітычнай улады.
2. Суб'екты і аб'екты, асновы і рэсурсы палітычнай улады.
3. Асноўныя функцыі і канцэпцыі ўлады.
4. Механізмы функцыяніравання і рэалізацыі, легітымнасць палітычнай улады.
5. Палітыка дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь да нацыянальных супольнасцей краіны.

### 1. Сутнасць, крыніцы і асаблівасці палітычнай улады

Улада з'яўляецца адной з найгалоўнейшых катэгорый паліталогіі, непарыўна злучаных з палітыкай. Чалавек у грамадстве ўвесь час сустракаецца з уладаю: ён сутыкаецца з рознымі яе ўзроўнямі і сам мае пэўную ўладу над іншымі. Як толькі з'яўляецца група, якая б малая яна ні была, адразу ўзнікае феномен улады. Бо адныя пачынаюць загадваць, а іншыя – слухацца і падпарадкоўвацца. Таму можна назіраць уладу і ў сям'і, і ў суполцы, і ў згуртаванні. Тым больш яскрава мы бачым феномены ўлады ў

палітычнай сферы грамадства. Паняцце ўлады падаецца такім універсальным у прасторы і ў часе, што многія даследчыкі – палітолагі імкнуцца зрабіць яго асноўным паняццем. Самай відавочнай праявају ўлады ў гісторыі чалавецтва была і ёсць дзяржава. Таму ўзаемадачыненні паміж уладаю і дзяржавай вызначальныя для формаў сацыяльнай арганізацыі. Развагі і назіранні людзей над праблемай улады паспрыялі нараджэнню таго, што сёння мы завём ідэалогіямі.

Існуе аб'ектыўнае запатрабаванне людзей у самарэгуляцыі і арганізацыі. У грамадстве заўжды ёсць розныя індывідуальныя і групавыя інтарэсы, якія неабходна рэгуліраваць, спалучаць, здымаючы сацыяльную напружанасць. Такім чынам, як адзначае палітолаг М.Дзенісюк, уладныя адносіны з'яўляюцца механізмам рэгуляцыі грамадскага жыцця, гарантам цэласнасці розных грамадстваў, старажытнай формай іх арганізацыі.

Існуюць розныя вызначэнні паняцця "улада". Т.Гобс сцвярджаў: "улада –гэта сродак дасягнуць дабарабыту ў будучым, а само жыццё – гэта вечнае і нястомнае імкненне да ўлады". М.Вэбер адзначаў, што "ўлада – гэта магчымасць рэалізаваць сваю волю насуперак супраціўленню іншых". Р.Даль падкрэсліваў: "улада дае магчымасць аднаму чалавеку прымусіць другога рабіць тое, што ён па сваёй волі не зрабіў бы". Х.Арэнд – "улада не належыць аднаму чалавеку, а толькі групе, якая дзейнічае сумесна". П.Морыс удакладняў: "улада – гэта працэс, які накіраваны на змяненне каго-небудзь ці чаго-небудзь".

Палітолагі падкрэсліваюць натуральны характар улады. Зло не ў самой уладзе, а ў тых, хто яе рэалізуе. Кожны чалавек ад пачатку ў той ці іншай ступені імкнецца да ўлады і велічы, прычым ёсць людзі, якія заўжды імкнуцца кіраваць, а іншыя падпарадкоўваюцца. Паміж гэтымі двумя палюсамі вялікая колькасць людзей, якія ў адных выпадках лёгка падпарадкоўваюцца, у іншых – кіруюць. У той жа час, наогул, ёсць людзі, якія зусім не жадаюць кіраваць. Варта адзначыць, што без імкнення да ўлады не бывае лідараў.

Такім чынам, нягледзячы на розніцу ў падыходах вучоных да разумення сутнасці ўлады, можна вылучыць яе агульныя характарыстыкі: здольнасць і магчымасць, гаспадства (уладарства) і падпарадкаванне. Без падпарадкавання няма ўлады, як і без улады няма падпарадкавання. Праявају ўлады з'яўляецца дзеянне, якое пабуджае людзей рабіць што-небудзь, чаго яны не зрабілі бы па сваёй волі. Гэта ўлада над кімсьці. У той жа момант ёсць улада для чагосьці, дзеля дасягнення пэўнай мэты. А.Гідэнс заўважыў: "улада, па сваёй прыродзе, не ёсць прыгнёт, яна ёсць здольнасць выбіраць вобраз дзеянняў ці магчымасць дабівацца вынікаў". Улада не з'яўляецца перашкодай на шляху да свабоды, наадварот, яна для яе пасрэднік, прамежкавае звяно.

**Улада** – гэта рэальная здольнасць тых ці іншых сацыяльных сіл альбо асобы ўвасабляць сваю волю ў адносінах да іншых сацыяльных сіл ці асобы.

***Крыніцы ўлады:***

а) структурна-функцыянальны падыход – улада гэта прадукт сістэмы сацыяльных адносін (эканамічных, сацыяльных, палітычных, рэлігійных і інш);

б) псіхалагічны падыход – імкненне да ўлады закладзена ў прыродзе індывіда;

в) прагматычны падыход – улада гэта імкненне чалавека да забеспячэння дабрабыту;

г) марксісцкі падыход – улада ў грамадстве класаў.

Можна вылучыць універсальныя ўласцівасці ўлады (М.Дзенісюк): яе ўсеагульнасць – функцыяніраванне ва ўсіх сферах грамадскага жыцця і палітычных працэсах; яе здольнасць быць ва ўсіх відах дзейнасці, аб'ядноўваючы ці раз'ядноўваючы людзей, грамадскія групы. Прастора ўлады можа быць вельмі маленькай, напрыклад, асоба чалавека, сям'я і празмерна вялікай – дзяржаўная ўлада, улада рэлігій, ідэалогій, міжнародных структур. Таму вылучаюцца розныя віды ўлады: эканамічная і палітычная; свецкая і царкоўная; заканадаўчая, выканаўчая і судовая; цэнтральная, рэгіянальная, мясцовая; дзяржаўная, партыйная, сямейная, улада апарата, лідараў, бацькоў і г.д.

Напачатку была (у старажытнасці) грамадская ўлада, пазней, ва ўмовах падзелу працы і ўласнасці, яна становіцца палітычнай. Паступова яна афармляецца ў законах, пераўтвараецца ў дзяржаўную. Палітычная ўлада мае больш шырокі змест.

**Палітычная ўлада** – рэальная здольнасць тых ці іншых сацыяльных суб'ектаў падпарадкаваць сваёй волі дзейнасць іншых сацыяльных суб'ектаў з дапамогаю дзяржаўна-прававых і іншых сродкаў. Гэта здольнасць і магчымасць грамадскіх сілаў праводзіць сваю волю ў палітыцы ў адпаведнасці з сваімі запатрабаваннямі і інтарэсамі.

Асноўныя ***рысы*** палітычнай улады:

1) легальнасць – законнасць улады; яна дзейнічае на аснове фіксіраваных нормаў, законаў, кодэксаў і г.д.;

2) легітымнасць – дабраахвотнае прызнанне існуючай улады падданымі, давер з іх боку (прызнаецца, а не проста навязваецца). Неабходна звярнуць увагу на тое, што легальнасць і легітымнасць не адно і тое ж. Улада можа быць легальнай, але не легітымнай;

3) вярхоўнасць альбо гасподства – абавязковасць выканання ўладных рашэнняў усімі членамі грамадства, павінны быць прыярытэты;

4) уплыў – здольнасць суб'екта палітыкі ўздзейнічаць у патрэбным накірунку на паводзіны асоб, груп і г.д.;

5) эфектыўнасць і выніковасць – у канкрэтных сацыяльных выніках правяраецца здольнасць улады кіраваць усімі сферамі грамадскага жыцця.

Палітычная ўлада заўжды мае грамадскі характар, бачна праз функцыяніраванне спецыяльных структур, прадугледжвае выкарыстоўванне прымусу, традыцый, маральнага ўплыву, сістэмы ідэалагічных і прававых норм. Палітычная ўлада выступае як суадносіны класавых і іншых сацыяльных сіл. Дзяржаўная ўлада – гэта непасрэдны прадукт палітычнай улады, яна носіць палітычны характар, бо дзяржава ў сваёй дзейнасці закранае інтарэсы практычна ўсіх частак насельніцтва. Але нельга палітычную і

дзяржаўную уладу атаясамліваць. Улада і палітыка непадзельны і ўзаемаабумоўлены.

## 2. Суб'екты і аб'екты, асновы і рэсурсы палітычнай улады

Улада ўзнікае ў адносінах паміж людзьмі, групамі людзей, грамадствам і яго часткамі – суб'ектамі, якія маюць свядомасць, волю, здольнасць дзейнічаць. Сама ўлада рабіць нічога не можа, дзейнічаюць людзі, якія маюць уладу або якія падпарадкоўваюцца. Таму выразы накшталт "улада грошай", "улада рэчаў", "улада ідэй", "улада над прыродай" – не больш, чым метафары, вобразныя выразы, якія ўжываюцца ў штодзённасці. Пачуцці, думкі, ідэі, грошы самі па сабе не з'яўляюцца аб'ектамі, не выконваюць волю чалавека. Яе могуць выконваць іншыя людзі, якія дзейнічаюць згодна ідэйных перакананняў, з-за грошаў, страху і г.д.

Безумоўна, у рэальным палітычным жыцці ўлада існуе ў прадметах, сімвалічных формах, дакументах, законах, інструкцыях, праграмах і г.д. Суб'ектамі улады могуць быць асобы, арганізацыі, супольнасці, саюзы дзяржаў, сусветная супольнасць. Першаснымі суб'ектамі з'яўляюцца індывіды, другаснымі – палітычныя аб'яднанні, суб'ектамі большага ўзроўню – палітычныя эліты і лідары. Звычайна суб'екты ўлады павінны валодаць такімі якасцямі, як жаданне ўладарыць, воля да ўлады, падрыхтаванасць да таго, каб узяць на сябе адказнасць, кампетэнтнасць, прафесіяналізм, уменне выкарыстоўваць рэсурсы, мець аўтарытэт.

***Да суб'ектаў*** палітычнай улады адносяцца:

- сацыяльныя супольнасці (народ, нацыі, класы, супольнасці і г.д.), якія ўплываюць на ўладу апасродкавана, але ў час палітычных пераменаў бяруць палітычную ўладу ў свае рукі шляхам бунта, паўстання, рэвалюцыі, грамадзянскага непадпарадкавання;
- дзяржава;
- палітычныя партыі і арганізацыі – асабліва правячыя, якія аказваюць уплыў на функцыяніраванне палітычнай улады;
- правячыя эліты, бюракратыя, лоббі (групы ціску);
- групавое ці асабістае лідэрства;
- асабістая ўлада;
- асобныя грамадзяне, падчас выбараў, рэферэндумаў;
- талпа (охлас), якая атрымоўвае ўладу ва ўмовах крызісу, адсутнасці якой-небудзь арганізацыйнай палітычнай сілы. У выніку захопу ўлады талпой усталёўваецца рэжым ахлакратыі, дзе пануюць эмоцыі, а не разум, уладараць цёмныя інстынкты.

Ад таго, як узаемадзейнічаюць суб'екты палітычнай улады, якія прынцыпы і характары іх узаемаадносін, залежыць стан палітычнага жыцця грамадства.

Пад аб'ектам разумеецца той, хто падпарадкоўваецца, на каго накіравана дзейнасць суб'ектаў палітычнай улады.

Улада залежыць ад пакоры насельніцтва, ад таго ці згодныя яе цярпець тады, калі яна не задавальняе насельніцтва. Якасьці аб'екта палітычнай улады залежаць ад палітычнай культуры насельніцтва. Напрыклад, патрыярхальны і паданіцкі тып культуры фарміруе пакору ў людзей, звычку падпарадкоўвацца, жаданне жыць пад "моцнай рукою". Актывісцкі тып культуры фарміруе грамадзяніна, які ведае сваю адказнасць за краіну, а не пакорлівага служку ўладу трымаючых.

Улада выкарыстоўвае розныя сродкі для свайго ўплыву на аб'ект. Пад рэсурсамі ўлады разумеюцца сродкі, выкарыстоўванне якіх забяспечвае ўплыў на аб'ект улады ў адпаведнасці з мэтамі суб'екта. Рэсурсы ўяўляюць з сябе альбо важныя для аб'екта каштоўнасці (грошы, прадметы ўжытку), альбо сродкі, якія здольныя паўплываць на ўнутраны свет, матывацыю чалавека (СМІ), альбо сродкі, з дапамогай якіх можна пазбавіць чалавека тых ці іншых каштоўнасцей, вышэйшай з каторых звычайна лічыцца жыццё (зброя, карныя органы і інш.).

Сістэма ***рэсурсаў*** суб'ектаў палітычнай улады:

а) дзяржаўная ўлада, з яе: магчымасцямі прымусу; эканамічнымі, сацыяльнымі і культурна-інфармацыйнымі рэсурсамі; манапольным правам выдаваць законы;

б) інтарэсы, перакананні людзей, іх пачуцці, эмоцыі (страх, нянавісць, зайдрасць, захапленне, энтузіазм, незадавальненне і інш.); нацыянальныя і рэлігійныя пачуцці. Варта адзначыць, што рэсурс тыпа інтарэса вызначаецца эканамічным патэнцыялам, падатковай, сацыяльнай палітыкай;

в) мова, як элемент палітычнай культуры. Мова ўлады абапіраецца на міфы, стэрэатыпы, а значэнне слоў залежыць ад волі правадыра, ад умення чытаць паміж строк. Моўная палітыка адыгрывае не апошнюю ролю ў рэальных палітычных працэсах, выбарчых кампаніях;

г) эканамічны, ваенны, культурны патэнцыял краіны, дзяржаўная тэрыторыя, стабільнасць і парадак, адзінства грамадства, прыродныя багацці, колькасць насельніцтва, яго якасць (культура, адукацыя, працоўныя навыкі і г.д.). Важнае значэнне маюць традыцыі, ідэалогія, вера, давер, грамадскі настрой, удзел насельніцтва ў палітычным жыцці, час, які мае ўлада для вырашэння сваіх задач;

д) веды, прафесіяналізм, прапаганда ва ўсіх яе формах, сродкі масавай інфармацыі (СМІ).

Розныя рэсурсы выкарыстоўваюцца звычайна суб'ектамі ўлады ў комплексе, прычым кожны тып рэсурсаў мае свае ўмовы рэалізацыі і мяжу эфектыўнасці, найбольш зручныя аб'екты і час дзеянняў. Так, для перакананняў найбольш падыходзіць моладзь. Апазіцыя абапіраецца на незадаволеных. Падчас рэвалюцый, войн часцей выкарыстоўваецца гвалт. Прымус найбольш распаўсюджаны ў краінах са слабымі, неразвітымі дэмакратычнымі традыцыямі. У грамадстве з традыцыямі індывідуалізма асноўны ціск робіцца на выкарыстоўванне матэрыяльнага інтарэса, грошаў, прычым выкарыстоўваецца і прымус – страх за жыццё, здароўе, дабрабыт.

### 3. Асноўныя функцыі і канцэпцыі ўлады

Каардынацыя адносін паміж буйнымі грамадскімі структурамі з'яўляецца функцыямі палітычнай улады. Улада павінна фарміраваць палітычную сістэму, палітычныя адносіны паміж дзяржаваю і грамадствам, грамадскімі групамі, класамі, палітычнымі інстытутамі, партыямі, грамадзянамі, органамі дзяржаўнага кіравання. Улада кантралюе гэтыя адносіны, пераўтвараючы іх па магчымасці ў бесканфліктныя і арганізаваныя. Як адзначае М. Дзенісюк, улада кіруе справамі грамадства і дзяржавы на розных ўзроўнях:

- макраўзроўне вышэйшых цэнтральных палітычных інстытутаў, дзяржаўных установаў, партый і арганізацый;
- сярэднім узроўні, які ўтвараюць установы рэгіянальнага, абласнога і раённага маштабаў;
- мікраўзроўне, які ахоплівае непасрэдна палітычныя адносіны людзей малых груп, самакіраванне. На гэтым ўзроўні фарміруюцца палітычная культура, меркаванні, перакананні людзей. Варта падкрэсліць, што гэты ўзровень не з’яўляецца ніжэйшым.

Ад функцыяніравання палітычнай улады шмат у чым залежыць тып палітычнага рэжыму ў грамадстве, адкрытасць ці закрытасць грамадства, характар палітычных адносін і іншыя палітычныя характратыстыкі дзяржавы, у тым ліку стабільнасць, аўтарытэт, падзел і супрацоўніцтва ўладаў, роля апазіцыі, дэмакратычнасць.

Такім чынам найбольш важныя грамадскія ***функцыі*** палітычнай улады:

а) падтрымка грамадскага парадку і стабільнасці;
б) выяўленне, абмежаванне і вырашэнне канфліктаў;
в) дасягненне грамадскай згоды;
г) прымушэнне ў імя сацыяльна-значных мэтаў і захавання стабільнасці;
д) кіраванне справамі грамадства.

У сучаснай літаратуры існуюць розныя канцэпцыі ўлады. Найбольш шырокавядомыя ***канцэпцыі*** ўлады:

- прававыя, якія грунтуюца на тым, што права першаснае, а палітыка і ўлада вытворчае ад права. Ідэі прававой дзяржавы;
- канцэпцыя паводзінаў (біхевіяральная) – палітычнае жыццё тлумачыцца з уласцівых чалавеку паводзінаў, яго волі, імкнення да ўлады;
- рэляцыянісцкая канцэпцыя ўлады характарызуе ўладу як міжасабовыя адносіны, якія дазваляюць аднаму індывіду змяняць паводзіны другога. Гэта адносіны суб'екта і аб'екта ўлады. Аб'ект улады мае магчымасць стаць яе суб'ектамі.

### 4. Механізмы функцыяніравання і рэалізацыі, легітымнасць палітычнай улады

Механізм функцыяніравання ўлады – гэта спосабы, метады і прыёмы дзейнасці ўлады. Найбольш вядомы спосабы:

- дэмакратычныя, з удзелам народа;

- аўтарытарныя, калі дзейнічае аднаасобнае праўленне з частковым кантролем над падданымі;
- таталітарныя, калі існуе поўны кантроль улады над грамадствам;
- дэспатычныя, якія прадугледжваюць усеўладдзе, гвалт, самадурства.

Каб найлепшым чынам скарыстаць магчымасці і хутчэй дасягнуць пастаўленых мэтаў і задаволіць інтарэсы, для ўлады вельмі важным з'яўляецца здабыццё легітымнасці.

***Легітымнасць*** абазначае прызнанне насельніцтвам менавіта гэтай улады, яе права ўладарыць, кіраваць. Абазначае, што ўладу падтрымлівае большасць, што менавіта гэтыя законы выконваюцца асноўнай часткай грамадства.

Легітымнасць, так як яна давер і апраўданне ўлады, шчыльна звязана з маральнай адзнакай улады. Грамадзяне ўхваляюць уладу, зыходзячы з маральных крытэрыяў дабра, справядлівасці, сумленнасці, прыстойнасці. Легітымнасць неабходна каб забяспечыць падпарадкаванне, згоду без прымусу, а калі гэта немагчыма, дык для апраўдання прымусу, выкарыстоўвання сілы. Легітымная ўлада і палітыка аўтарытэтны і эфектыўны.

Легітымнасць можа быць як здабыта, так і згублена. Каб здабыць і ўтрымаць легітымнасць, давер народа, улада выкарыстоўвае аргументацыю сваіх дзеянняў і звяртаецца да вышэйшых каштоўнасцей (справядлівасці, праўды), да гісторыі, пачуццяў і эмоцыяў, настрояў, рэальнай ці выдуманай волі народа, наказам часу, навукова-тэхнічнаму прагрэсу, запатрабаванням вытворчасці, гістрычным задачам краіны і г.д. Для апраўдвання гвалту, рэпрэсій часцяком выкарыстоўваюць падзел людзей на сяброў і ворагаў. Прынцыпы легітымнасці маюць вытокі ў старажытных традыцыях, рэвалюцыйнай харызме, або ў дзейнічаючым заканадаўстве.

Адсюль – існуе тры **тыпы легітымнасці** ўлады :

- ***традыцыйная*** – заснавана на веры ў свяшчэнны характар норм, звычаяў, традыцый, якія непарушны;
- ***харызматычная*** – вера мас у асаблівыя якасці правадыра, штучнае ўзвышэнне лідэра (любоў да "бацькі нацыі", асобая місія, неабходнасць у эканамічным і палітычным развіцці "прарыва" і г.д.);
- ***рацыянальна-прававая*** – на падставе заканадаўства, выбарнасці, раўнапраўя палітычных сіл, абмежавання сферы дзейнасці дзяржавы і г.д. (магчыма у дэмакратычных дзяржавах).

Сучасная беларуская дзяржаўнасць з'яўляецца рэжымам харызматычнага тыпу. Недакладнае размежаванне кампетэнцыі паміж дзяржаўнымі органамі і галінамі ўлады, пагарджэнне існуючымі прававымі нормамі, палавінчаты характар законаў і іх ігнараванне – усё гэта сведчыць аб тым, што рацыянальна-прававы спосаб легітымнасці ўлады толькі фарміруецца.

Палітычная ўлада і механізмы яе здзяйснення ў Беларусі сфармуліраваны ў артыкулах 1-8, 79, 90, 106-107 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

## 5. Палітыка дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь да нацыянальных супольнасцей краіны

Звяртаючы ўвагу на падзеі ў Францыі ў лістападзе 2005 года, можна разглядаць Рэспубліку Беларусь як астравок міжэтнічнага міру і спакою ў Еўропе. Але для таго, каб такое становішча склалася ў краіне, рэспубліка прайшла вельмі складаны і працяглы ў часе шлях і свой уплыў аказала талерантнасць беларускага народа.

Пасля атрымання ўлады перад бальшавікамі паўстала, як першачарговая, задача зняць супярэчнасці, негатыўныя моманты, якія мелі месца ў нацыянальнай палітыцы Расіі. Толькі павярнуўшы на свой бок усе народы, якія жылі на яе тэрыторыі, можна было разлічваць на поспех у будаўніцтве новага грамадства. Важным актам на шляху абвяшчэння роўнасці, зняцця напружанасці паміж народнасцямі з'явілася «Дэкларацыя правоў народаў Расіі» прынятая 2 (15) лістапада 1917 г. Яна ўключала наступныя пункты : а) роўнасць і суверэннасць народаў Расіі; б) права народаў Расіі на свабоднае самавызначэнне аж да аддзялення і ўтварэння самастойных дзяржаў; в) адмена ўсіх і ўсялякіх нацыянальных і нацыянальна-рэлігійных прывілеяў і абмежаванняў; г) свабоднае развіццё нацыянальных супольнасцей і этнаграфічных груп, насяляючых тэрыторыю Расіі. Для правядзення ў жыццё дэклараваных правоў народаў быў утвораны Наркамат па справах нацыянальнасцей. Гэта была новая кіруючая структура ў сферы ўлады, якая адсутнічала раней у царскім і Часовым урадах.

У Беларусі недавер і варожасць сярод насельніцтва розных нацыянальнасцей ускладняліся шэрагам абставін. Гэта ў першую чаргу рэлігійны фактар. Складанасць выклікала адрозненне нацыянальнага складу гарадскіх і сельскіх жыхароў. Вядома, што ў гарадах і мястэчках пераважала яўрэйскае насельніцтва, у вёсках - беларускае. Глыбокі псіхалагічны след, падазронасць паміж людзьмі, якія апынуліся не па сваей волі на супрацьлеглых ваюючых баках, пакінула польска-савецкая вайна. Таму пасля заканчэння ваеннай кампаніі пытанні вырашэння нацыянальных праблем выйшлі на пярэдні план. У “Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь”, прынятай 31 ліпеня 1920 г., падкрэслівалася, што дзяржава “будзе будаваць сваё жыццё на аснове прыцягнення ў савецкае будаўніцтва самых шырокіх працоўных мас незалежна ад таго, да якой нацыянальнасці і вызначэння яны належаць. Абвяшчаецца поўнае раўнапраўе моў (беларускай, рускай, польскай і яўрэйскай)”.

З канца 1920-х гг. адбываўся паварот у нацыянальнай палітыцы краіны. Годам «вялікага пералому» стаў 1929 г., калі пачалося канчатковае згортванне НЭПа, прымусовая татальная калектывізацыя, фарсіраваная індустрыялізацыя. На практыцы гэта праяўлялася ў імкненні да «спрашчэння» этнанацыянальнай і моўнай структуры краіны, згортвання ўжывання нацыянальных моў.

Наступ на нацыянальныя супольнасці працягваўся і ў пасляваенны час (1945-50-я гг.), - калі культ асобы Сталіна дасягнуў свайго апагею. Першыя

пасляваенныя гады азнаменаваліся адкрыццём у рэспубліцы школ нацыянальных супольнасцей, але пасля 1947 года былі закрыты польскія і украінскія.

Не адбылося змен у адносінах да нацыянальных супольносцей і пасля XX з'езда КПСС. Гэтаму садзейнічалі праграмныя ўстаноўкі, якія арыентавалі на нерэальныя тэрміны пабудовы камунізму ў Савецкім Саюзе, сцвярджэнне, што ў СССР пабудавана развітое сацыялістычнае грамадства. Такія памылковыя навуковыя прагнозы і тэорыі садзейнічалі далейшаму назапашванню дэфармацый у нацыянальнай сферы. Справа зайшла так далёка, што набыў моц працэс вымірання нацыянальных моў. Калі па перапісе 1926 г. у СССР былі зафіксаваны 194 мовы, то па перапісе 1979 г. – 130-140.

Такая палітыка садзейнічала зніжэнню ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці, скарачэнню элементаў нацыянальнай культуры этнічных супольнасцей. Перад усімі народамі паўстала задача – змірыцца з наяўным становішчам ці пайсці па шляху адраджэння. Новыя ўмовы для развіцця нацыянальных супольнасцей адкрыла хваля нацыянальна-культурнага адраджэння часоў "перабудовы" ў СССР, стварыўшая магчымасць аднаўлення ўсяго таго, што было згублена ў ранейшыя гады.

Важную ролю ў адраджэнні культуры, традыцый этнічных супольнасцей адыграў вераснёўскі (1989 г.) пленум ЦК КПСС, які разгледзеў пытанні нацыянальнай палітыкі. На хвалі адраджэння пачалі ствараецца нацыянальна-культурныя аб'яднанні, мэтай якіх з'яўлялася арганізацыя работы па вывучэнні мовы, гісторыі, культуры сваіх народаў. У 1988 г. узнікла Гродзенскае абласное польскае культурна-асветніцкае таварыства імя А.Міцкевіча. У чэрвені 1990 г. на з'ездзе была ўтворана рэспубліканская арганізацыя – Саюз палякаў Беларусі (СПБ).

На думку У. Навіцкага: “Савецкая палітыка адносна этнічных супольнасцей мела не толькі станоўчыя моманты, але і сур'ёзныя памылкі і пралікі. Гэта прывяло да глубокага крызісу ў міжнацыянальных адносінах, які да сённяшнята дня адчуваецца на постсавецкай прасторы”.

Рэспубліка Беларусь – краіна міжнацыянальнага міру і згоды. З’яўляючыся шматнацыянальнай дзяржавай, у Рэспубліцы Беларусь пражываюць прадстаўнікі больш за 140 нацыянальнасцей, унутраная палітыка краіны накіравана на стварэнне і замацаванне даўніх міжэтнічных сувязей, зняцце міжнацыянальнай напружанасці па расавай, лінгвістычнай і канфесіянальнай аснове. Органы ўлады Рэспублікі Беларусь імкнуцца да захавання міжнацыянальнага даверу, падтрымліваюць розныя формы міжкультурнага дыялогу.

У той жа час у дзеяннях беларускіх улад праглядваецца пэўная недапрацаванасць, а часам і аднабаковасць падыходаў да тых ці іншых пытанняў існавання і дзейнасці нацыянальных аб’яднанняў.

Возьмем, напрыклад, Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, дзе артыкулам сто трыццатым уведзена адказнасць за ўзбуджэнне расавай, нацыянальнай, рэлігійнай варожасці, за прыніжэнне нацыянальнай годнасці. У той жа час ніякай адказнасці за прамое або ўскоснае абмежаванне правоў або ўсталяванне прамых або ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад адносін да рэлігіі няма. Такім чынам, службовыя асобы, якія ўшчэмліваюць правы грамадзян

у залежнасці ад расавай, нацыянальнай прыналежнасці або адносін да рэлігіі, практычна не могуць быць прыцягнуты да адказнасці. Адсюль, суб'ектыўны фактар адносін чыноўніка да той ці іншай нацыянальнасці будзе ўплываць на кадравую палітыку ў пэўнай галіне, вобласці, і пры гэтым заканадаўча чыноўніку забяспечана беспакаранасць.

За парушэнне заканадаўства аб мовах устаноўлена толькі адміністрацыйная адказнасць: артыкул 172 указвае, што за публічнае знеслаўленне дзяржаўных і іншых нацыянальных моў, якімі карыстаецца насельніцтва Рэспублікі Беларусь, стварэнне перашкод і абмежаванняў у карыстанні імі – цягнуць накладанне штрафу на грамадзян у памеры ад дзвюх да пяці базавых велічынь, на службовых асоб – у памеры ад пяці да дзесяці базавых велічынь. У той жа час усім вядомы адносіны прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей да сваіх нацыянальных моў. Артыкул 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь абвяшчае дзве дзяржаўныя мовы: рускую і беларускую, і ўстанаўлівае, адпаведна, іх абарону, не агаворваючы да якой адказнасці могуць быць прыцягнуты парушальнікі. Адсюль, за парушэнне норм Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (артыкула 17) і Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", на маю думку, варта было б устанавіць крымінальную адказнасць.

Звернемся яшчэ да Закона "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь". Разглядаючы гэты Закон, можна прыйсці да высновы, што дзяржава пэўным чынам адыходзіць ад вырашэння праблем мовы выхавання ў дашкольных установах і мовы навучання і выхавання у агульнаадукацыйных школах. У адпаведнасці з артыкулам 22 Закона згодна пажаданняў грамадзян па рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў могуць стварацца дзіцячыя дашкольныя ўстановы або асобныя групы, у якіх выхаванне вядзецца на мове нацыянальнай супольнасці. У адпаведнасці з артыкулам 23 дадзенага Закона ў адпаведнасці з пажаданнямі грамадзян і па рашэнню мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў могуць стварацца агульнаадукацыйныя школы або класы, у якіх вучэбна-выхаваўчы працэс вядзецца на мове нацыянальнай супольнасці, або вывучаецца мова нацыянальнай супольнасці.

І справа тут у наяўнасці ў артыкулах некалькіх агаворак:

– могуць стварацца;

– па рашэнню выканаўчых і распарадчых органаў.

Ведаючы закасцянеласць чыноўніцтва, можна з вялікай доляй упэўненасці сцвярджаць, што агаворка "могуць стварацца" разглядаецца як спосаб ставіць перашкоды да стварэння. І яна звязваецца з другой агаворкай у тым сэнсе, што выканаўчыя і распарадчыя органы зыходзяць з наяўнасці фінансавання такіх дашкольных устаноў і школ. А фінансаванне напрамую залежыць ад агаворкі "могуць". Адсюль, неабходна ўнесці змены ў існуючы Закон і ўбраць дадзеную агаворку.

Тады артыкулы Закона будуць гучаць адназначна і абавяжуць выканаўчыя і распарадчыя органы ствараць дашкольныя ўстановы і агульнаадукацыйныя школы на мовах нацыянальных супольнасцей. Пры гэтым, заканадаўцам неабходна было б падумаць аб крыніцах фінансавання такой дзейнасці і, адпаведна, вызначыць іх у Законе.

Да таго ж, Закон “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” мае яшчэ адну загану. Па дадзеных перапісу насельніцтва 1999 года 81% жыхароў Беларусі вызначылі сябе як беларусы. Але артыкулы Закона (22, 23, 27) разглядаюць мовы, якія могуць выкарыстоўвацца ў выхаванні, навучанні, у сродках масавай інфармацыі ў інтэрпрэтацыі “беларуская мова і (або) руская мова”. Менавіта гэта “або” указвае на пэўныя перавагі для прадстаўнікоў рускай нацыянальнасці, якіх у нас пражывае, па дадзеных таго ж перапісу, усяго 11%, перад тымі ж беларусамі. Зразумела, гэта вялікая колькасць насельніцтва (рускіх больш мільёна чалавек, у той час, як на астатнія нацыянальнасці, якіх больш за 140, прыпадае каля васьмісот тысяч чалавек), але як жа тады быць з прынцыпам, прадугледжаным артыкулам 22 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, аб роўнасці правоў і законных інтарэсаў.

Адсюль і ў гэтыя артыкулы неабходна ўнасіць змены, выдаліўшы “або” і пакінуўшы “мовай выхавання, навучання, сродкаў масавай інфармацыі з’яўляецца беларуская мова і руская мова”.

У той жа час, артыкулам 21 Закона “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь“ устаноўлена норма, згодна якой кіраўнікі і іншыя супрацоўнікі сістэмы адукацыі павінны валодаць беларускай і рускай мовамі.

Звернемся да яшчэ аднаго Закона Рэспублікі Беларусь “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь”. У адпаведнасці з артыкулам пятым Закона прыналежнасць грамадзяніна да той ці іншай нацыянальнасці з’яўляецца яго асабістай справай, і ніхто не мае права прымушаць грамадзяніна Рэспублікі Беларусь даказваць сваю нацыянальную прыналежнасць або адмаўляцца ад яе.

У той жа час існуе інструкцыя “Аб парадку вызначэння нацыянальнай прыналежнасці грамадзян Рэспублікі Беларусь”, узгодненая з намеснікам міністра унутраных спраў, старшыней Камітэта по справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, у адпаведнасці з якой у пашпарце грамадзяніна робіцца адзнака аб нацыянальнасці толькі тады, калі грамадзянін гэтага пажадаў. Але пасля ўказання нацыянальнай прыналежнасці яе змяніць магчыма толькі ў судзе, у той час, як у пятым артыкуле Закона “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” указваецца на недапушчальнасць прымусу даказваць сваю нацыянальнасць. Чалавечыя лёсы бываюць разнастайныя і нават у сталага чалавека могуць з’явіцца такія звесткі, што ён вырашыць змяніць сваю нацыянальную прыналежнасць, а тут неабходна ісці ў суд і даказваць сваю новую нацыянальную прыналежнасць, і гэта супярэчыць Закону. Трэба адзначыць, што асобы, якім адзнака аб нацыянальнай прыналежнасці была ўнесена ў пашпарт да дасягнення 18 гадовага ўзросту, могуць змяніць нацыянальнасць па дасягненні імі 18 гадовага ўзросту адпаведна нацыянальнасці бацькі ці, наадварот, маці.

Таксама “хваробай” вышэй азначанага Закона з’яўляецца наяўнасць агаворак “могуць”. Так, у адпаведнасці з артыкулам сёмым пры мясцовых саветах дэпутатаў могуць стварацца і дзейнічаць на грамадскіх пачатках дарадчыя органы з прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей, а ў адпаведнасці з артыкулам 10 Закона грамадскія аб’яднанні грамадзян, якія адносяць сябе да нацыянальных супольнасцей, могуць ствараць культурна-асветніцкія ўстановы.

Менавіта выкарыстанне “могуць” дае магчымасць уладам, зыходзячы з інтарэсаў перш за ўсё саміх улад, ствараць вышэй азначаныя органы і ўстановы ці не. Тым больш, што фінансавых сродкаў, па крайней меры значных, на гэтыя мэты не трэба.

Таксама праблемай з’яўляецца вызначэнне асоб, якія ў адпаведнасці з Законам адносяцца да нацыянальных супольнасцей. І тут узнікае супярэчнасць. У адпаведнасці з артыкулам першым Закона “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” пад нацыянальнымі меншасцямі разумеюцца асобы, якія належаць да нацыянальных супольнасцей, і якія маюць грамадзянства Рэспублікі Беларусь. І атрымоўваецца, што асобы, якія належаць да нацыянальных супольнасцей і якія прыехалі ў Рэспубліку Беларусь два, тры, пяць год не прылучаюцца да нацыянальных супольнасцей, бо не маюць грамадзянства, на якое яны маюць права разлічваць толькі праз сем год (частка 1 артыкула 14 Закона “Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь”).

Яшчэ адной з’явай, якая не дазваляе дастаткова ясна і слушна ўявіць адносіны ўлады да нацыянальных супольнасцей, з’яўляецца адсутнасць адзінай агульнапрызнанай назвы нацыянальных супольнасцей. Так, артыкулам 14 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей разглядаюцца як прадстаўнікі “нацыянальных супольнасцей”. Канстытуцыя была прынята 15 марта 1994 года, і ў яе ўносіліся змены 24.11.1996 г. Але, у нарматыўных актах, якія з’явіліся пазней, выкарыстоўваецца тэрмін нацыянальныя меншасці – Закон “Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь” 2003 г., Закон “Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь “Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь” 1998 г. і інш.

Таму ўладам неабходна самім вызначыцца на адным тэрміне і выкарыстоўваць яго ва ўсёй заканадаўчай базе краіны. На міжнародным узроўні замацаваны тэрмін нацыянальныя меншасці, напрыклад, Рамачная канвенцыя Савета Еўропы аб ахове нацыянальных меншасцей, Маскоўская канвенцыя “Аб забеспячэнні праў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей” і інш. Таму, магчыма, неабходна і ў Рэспубліцы Беларусь замацаваць гэты тэрмін у якасці адзінага. Але зноў узнікае праблема – неабходна уносіць змены у Канстытуцыю.

У нашай краіне грамадскія аб’яднанні маюць свае друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, сярод якіх адна газета на ўкраінскай мове, дванаццаць газет і часопісаў на польскай мове, адна газета на літоўскай мове. Але, калі разглядаць колькасць прадстаўнікоў нацыянальных супольнасцей і колькасць сродкаў масавай інфармацыі, якія выдаюцца нацыянальнымі аб’яднаннямі, то адразу кідаецца ў вочы дысбаланс.

Зразумела, што выданне газеты справа нетанная. Таму многія нацыянальныя аб’яднанні не маюць сродкаў, каб выдаваць газету ці часопіс. Таму было б няблага, каб дзяржава давала магчымасць (паласу, старонку, нумар у месяц і г.д.) нацыянальным аб’яднанням выкарыстоўваць дзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі. Пакуль што такая магчымасць нацыянальным аб’яднанням не прадастаўляецца.

Дзяржаўная ўлада ўдзяляе асаблівую ўвагу нацыянальнаму пытанню, працы з нацыянальнымі супольнасцямі і гэта можна прасачыць па стварэнню органаў, якія займаюцца вырашэннем праблем нацыянальных супольнасцей.

У адпаведнасці з планам работы Міністэрства культуры на 2001 год на базе Беларускага дзяржаўнага інстытута праблем культуры з 26 па 28 красавіка праходзіў рэспубліканскі семінар кіраўнікоў нацыянальна-культурных аб'яднанняў, органаў культуры гарадоў і раёнаў кампактнага пражывання нацыянальных супольнасцей па праблемах развіцця нацыянальных культур і ўзаемадзеяння з нацыянальнымі культурна-асветніцкімі аб'яднаннямі.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь за № 1587 ад 02.12.97г. "Аб каардынацыйным Савеце на справах нацыянальных супольнасцей Беларусі" было вырашана даручыць стварыць у 1998 годзе пры Камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей – Каардынацыйную Раду па справах нацыянальных супольнасцей для садзейнічання рэалізацыі правоў грамадзян розных нацыянальнасцей, каардынацыі дзейнасці рэспубліканскіх органоў дзяржаўнага кіравання па стварэнню ўмоў і аказанню дапамогі ў асветніцкай дзейнасці аб'яднанням нацыянальных супольнасцей Беларусі, выпрацоўкі рэкамендацый па практычнаму ўвасабленню дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі. Рада таксама павінна разглядаць пытанні ўзаемадзеяння з беларускім замежжам. У Раду ўвайшлі прадстаўнікі міністэрстваў, органаў кіравання, нацыянальна-культурных аб'яднанняў Беларусі.

У чэрвені 2001 года адбылося аднаўленне складу Каардынацыйнага Савета па справах нацыянальных супольнасцей Беларусі пры Камітэце па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

23.03.2004г.у Камітэце па справах рэлігіі і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь адбылася сустрэча з кіраўнікамі грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей. У прынятай рэзалюцыі адзначалася: "…п.2. Прызнаць мэтазгодным стварэнне Кансультатыўнага савета грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей пры Камітэце, які будзе спрыяць пашырэнню магчымасцей грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей у іх статутнай дзейнасці і дапамозе ад зацікаўленных".

У кожнай вобласці Рэспублікі Беларусь маюцца абласныя праграмы працы з нацыянальнымі супольнасцямі, а ў дзяржаве "Праграма мер па рэгуліраванню этнаканфісіянальнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь".

У вобласцях і раённых цэнтрах Беларусі створаны і працуюць камісіі садзейнічання кантролю за выкананнем заканадаўства аб свабодзе веравызнання і рэлігійных арганізацый пры выканкамах. Маюцца планы працы, праводзяцца пасяджэнні, фіксіруюцца пратаколы, у якіх разглядаюцца пытанні "этнаканфесійнай сітуацыі". Аднак займаюцца камісіі толькі рэлігійнай дзейнасцю. Міжнацыянальныя адносіны, спрыянне нацыянальнаму адраджэнню і г.д. да 2004 года ўключна не былі прадметам разгляду ніводнага разу.

З боку дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь, у пэўных сітуацыях, заўважаюцца факты палітыкі падвойных стандартаў у адносінах да некаторых грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей. Напрыклад, з 1990 года на Гродненскім абласным тэлебачанні выходзіла ў эфір тэлеперадача – праграма на

польскай мове “Над Нёманам”. У першай палове 2003 года перадача не выходзіла з-за недахопу фінансавых сродкаў. Не існавала і ў чэрвені 2004 г. У сакавіку 2004 года ў Міністэрстве інфармацыі і Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь не знайшла падтрымку ідэя аб стварэнні на Першым Нацыянальным тэлеканале штотыднёвай аўтарскай праграмы аб дзейнасці нацыянальных супольнасцей Беларусі. З сакавіка 1994 года па 1999г. газета палякаў ”Głos znad Niemna” фінансавалася з сродкаў дзяржаўнага бюджэту. З-за непаразумення з уладамі падчас падзеяў 1999 года, у снежні 2000 года Дзяржаўны камітэт Рэспублікі Беларусь па друку паведаміў, што няма магчымасці аднавіць фінансіраванне выданняў газеты “Głos znad Niemna” і часопіса “Magazyn Polski”. У жніўні 1999 года пры падрыхтоўцы дакументаў да перарэгістрацыі ўзніклі праблемы ў Міністэрстве юстыцыі (незразумелыя заўвагі да мэтаў, задач аб’яднання і г.д.) у ГА “Рускае таварыства”. На думку старшыні “Рускага таварыства” М.І.Ткачова гэта былі вынікі “ініцыятыў” амбасады Расіі, якая дзейнічала ў рэчышчы падтрымкі Мінскага гарадскога таварыства “Русь”. У сакавіку 1999 года прагучала крытыка Дзяржкамітэта ў бок рэдакцыі газеты “Głos znad Niemna”. Гэта тычылыся таго, што былі надрукаваны матэрыялы ў якіх асвятлялася пэўная дзейнасць старшыні ГА СПБ Т. Гавіна. У прыватнасці яго заклікі да правядзення несанкцыяніраванных пікетаў перад будынкам Гродненскага аблвыканкама, арганізацыя і правядзенне 20.11.98 г. ГА СПБ не дазволенага пікеціравання будынка Навагрудскага РВК (наконт патрабавання забеспячэння правоў бацькоў і іх дзяцей вучыцца на роднай – польскай мове), удзел кіраўніцтва ГА СПБ у палітычных акцыях – мерапрыемствах незарэгістраванага аб’яднання “Хартыя 97”, “кангрэсе дэмакратычных сіл” і г.д.


Судовая ўлада ўвасабляецца шляхам рэалізацыі правасуддзя, якое бывае крымінальным, грамадзянскім, адміністратыўным, канстытуцыйным. Судовая ўлада паняцце складанае, шматзначнае, у ім шмат элементаў. Але аснова, стрыжань яе складае факт аб тым, што правасуддзе вяршыцца толькі судом. Рашэнне суда – гэта закон.

У якасці суддзяў выступаюць асобы, якія прайшлі спецыяльную працэдуру прызначэння і выбрання, маюць спецыяльную адукацыю, вопыт, адпаведныя маральныя якасці.

Шэраг краін замацоўваюць прынцыпы правасуддзя і прынцыпы судовага ладу і судаводства ў канстытуцыях ці спецыяльных законах. Судовая ўлада Рэспублікі Беларусь адлюстравана ў Арт. 109-116 Канстытуцыі.

Асноўныя ***прынцыпы дзейнасці судоў***: незалежнасць, калегіяльнасць, прафесіяналізм, права на скаргу, галоснасць. Акрамя таго, вядомы наступныя прынцыпы: роўнасць бакоў у працэсе і спаборнасць пры разглядзе спраў. Спаборнасць – гэта дадатак да прынцыпа роўнасці бакоў.

***Класіфікацыя судоў.***

Акрамя судоў першай інстанцыі, другой, вышэйшых і вярхоўнага, маюцца спецыяльныя суды (адміністратыўныя, па працоўных спрэчках, фінансавыя, патэнтныя, ваенныя, мытныя, дысцыплінарныя) і недзяржаўныя (трэцейскія, рэлігійныя, міравыя).

Незалежна ад спецыялізацыі суда, любыя суды маюць пэўную структуру (пабудову), дакладней, іерархічную ці вертыкальную структуру ўладкавання судовых органаў. Гэта зроблена для таго, каб у бакоў або ў падсуднага была магчымасць абскардзіць вынесенае рашэнне ці прысуд; для таго, каб была інстанцыя, якая праверыць рашэнне ніжэйшага суда.

Існуе два варыянты абскарджвання судовых рашэнняў: касацыя і апеляцыя.

***Касацыйны*** парадак абскарджвання – гэта калі суд другой інстанцыі разглядае матэрыялы справы і правярае іх з фармальнага пункту гледжання. Калі будуць знойдзены нейкія недахопы , дык рашэнне будзе адменена і адпраўлена на паўторны разгляд. Пры ***апеляцыйнай*** форме вышэйстаячы суд зноўку разглядае ўсю справу пры ўдзеле бакоў, з выклікам сведкаў. Судовае пасяджэнне адбываецца другі раз, але суддзямі больш высокай кваліфікацыі. У выніку прымаецца новае рашэнне, новы прысуд. Апеляцыйны суд не накіроўвае справы на перагляд, ён сам гэта робіць.

Неабходна ведаць, што любы суд абавязаны дзейнічаць і дзейнічае згодна пэўных правіл і трымаецца пэўных працэдур. Судовыя справы разглядаюцца адкрыта, галосна, публічна. Напрыканцы разгляду справы выносіцца рашэнне, якое афармляецца ў пісьмовым выглядзе. Адбітак (копія) гэтага рашэння даецца баку, які быў асуджаны, альбо, калі была спрэчка, – двум бакам. Любы суд – гэта пэўная працэдура, гэта прымяненне закона, гэта пэўнае месца ў сістэме ўлады, пэўны аўтарытэт і традыцыя.

Самы значны прынцып дзейнасці любога суда – незалежнасць суда. Большасць канстытуцый краін свету фіксіруе прынцып незалежнасці суда. У дыктатарскіх і таталітарных рэжымах судовая ўлада залежыць ці падпарадкавана выканаўчай уладзе.

Належнае жыццё грамадства магчыма толькі пры ўмовах законнасці, незалежнасці судоў і разуменні таго, што судовае рашэнне павінна выконвацца абавязкова і ўсімі.

## ЛЕКЦЫЯ 8. ПАЛІТЫЧНЫЯ ПАРТЫІ І ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ

1. Палітычная партыя: паняцце, тыпы і роля ў механізме палітычнай улады.
2. Сутнасць і тыпы партыйных сістэм. Асаблівасці станаўлення партыйнай сістэмы ў Рэспубліке Беларусь.
3. Грамадскія арганізацыі і грамадскія рухі.
4. Дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі

### 1. Палітычная партыя: паняцце, тыпы і роля ў механізме палітычнай улады

Тэрмін "партыя" (ад лац. partio – падзяляю) у перакладзе з лацінскай мовы абазначае частку якой-небудзь буйнай супольнасці. У палітычнай літаратуры сустракаюцца розныя пункты гледжання на пытанне ўзнікнення палітычных партый. Палітычныя партыі і палітычныя сістэмы ўяўляюць з сябе прадукт працяглага гістарычнага развіцця. Можна вылучыць тры этапы ў гісторыі развіцця палітычных партый: арыстакратычная групоўка, палітычны клуб, масавыя партыі. Першая масавая партыя ўзнікла ў 1861 г. – Ліберальнае таварыства рэгістрацыі выбараў у Англіі. У 1902 г. была створана першая партыя Беларусі – Беларуская рэвалюцыйная партыя, пазней БСГ (Беларуская сацыялістычная грамада). Да яе ўтварэння спрычыніліся: В.Іваноўскі, І.Луцкевіч, А.Луцкевіч, А.Бурбіс, К.Кастравіцкі, В.Ластоўскі і інш.

Даследчык Т.Салавей адзначае, што склаліся розныя падыходы да разумення сутнасці палітычных партый. Сярод асноўных вылучае:

- ідэалагічны накірунак, калі партыя разглядаецца як ідэйная супольнасць, саюз ідэйных аднадумцаў, якіх аб'ядноўваюць агульныя погляды, інтарэсы і перакананні;
- арганізацыйны падыход, які падкрэслівае перадусім арганізацыйна-структурны аспект дзейнасці партыі, вылучаюцца наступныя прыкметы партыі: наяўнасць структуры, працяглы тэрмін існавання і г.д.;
- функцыянальны падыход, які прадугледжвае даследаванне палітычных дзеянняў, ролі і задач партый у палітычным механізме, іх удзелу ў падрыхтоўцы і правядзенні выбараў.

Усе гэтыя падыходы да вызначэння партыі адлюстроўваюць значныя для яе жыццядзейнасці моманты. На падставе гэтага найбольш шырока распаўсюджана наступнае паняцце партыі.

**Палітычная партыя** – гэта арганізаваная група аднадумцаў, якая прадстаўляе інтарэсы часткі народа і ставіць перад сабою мэту іх рэалізацыі шляхам заваёвы дзяржаўнай улады ці ўдзелу ў яе рэалізацыі.

Асноўнымі ***прыкметамі*** палітычных партый з'яўляюцца:

а) сувязь з пэўным класам, супольнасцю, групай – наяўнасць сацыяльнай базы;

б) валоданне пэўнай праграмай дзейнасці;

в) наяўнасць арганізацыйнай структуры (сяброўства, субардынацыя органаў, партыйны аппарат і г.д.);

г) устаноўка на дасягненне палітычнай улады і дзеянні па яе практычнаму ўвасабленню.

Спецыфіка партыі як палітычнага інстытута – гэта яўная барацьба за палітычную, дзяржаўную ўладу. Менавіта гэтым палітычная партыя і адрозніваецца ад іншых грамадскіх аб'яднанняў (грамадскіх арганізацый і рухаў), якія таксама актыўна ўдзельнічаюць у палітычным жыцці, але не дамагаюцца прамога кантролю над урадавай уладаю.

Месца і роля партыі ў палітычнай сістэме шмат у чым вызначаецца яе функцыямі. Функцыі адлюстроўваюць асноўныя задачы і накірункі дзейнасці палітычнай партыі, яе прызначэнне ў грамадстве.

***Функцыі*** палітычных партый:

а) прадстаўніцтва сацыяльных інтарэсаў;

б) выпрацоўка праграмных мэтаў;

в) фарміраванне грамадскай думкі, палітычная адукацыя і палітычная сацыялізацыя грамадзян;

г) удзел у барацьбе за ўладу і яе рэалізацыя;

д) падрыхтоўка і вылучэнне кадраў.

У межах гэтых функцый магчыма вылучэнне больш прыватных, канкрэтных задач. Змест, формы і метады ажыццяўлення адных і тых жа функцый могуць адрозніваца ў партый розных тыпаў.

Тып партыі – гэта паняцце, якое адлюстроўвае найбольш істотныя прыкметы пэўнай групы палітычных партый. Палітолаг Т.Салавей называе розныя крытэрыі, якія могуць быць пакладзены ў аснову тыпалогіі: сацыяльная база, ідэалагічны воблік, прынцыпы арганізацыі, метады дзейнасці і інш.

***Тыпы палітычных партый:***

а) У адносінах да існуючага парадку, зместу мэтаў і задач – рэвалюцыйныя партыі (радыкальныя якасныя пераўтварэнні грамадства), рэфармісцкія (паляпшэнне грамадскага жыцця шляхам рэформ), кансерватыўныя (захаванне ўстойлівых форм грамадскага жыцця), рэакцыйныя партыі (аднаўленне папярэдніх парадкаў і структур).

б) У адпаведнасці з характарам членства, прынцыпамі арганізацыі партыі – кадравыя, масавыя, партыі выбаршчыкаў.

в) Згодна ідэалагічнай накіраванасці – кансерватыўныя, ліберальныя, камуністычныя партыі, якія абапіраюцца на розныя рэлігійныя і нацыянальныя дактрыны.

г) Згодна месца ў сістэме дзяржаўнай улады – правячыя і апазіцыйныя; па ўмовах дзейнасці – легальныя, напаловулегальныя і нелегальныя.

д) Згодна прыярытэту каштоўнасцей – левыя, правыя, цэнтрысцкія, ультралевыя, ультраправыя, экстрэмісцкія.

У левых партый прыярытэты: абшчынны спосаб жыццядзейнасці людзей, грамадская ўласнасць, сацыяльная роўнасць, сацыяльная справядлівасць.

У правых: індывідуалізм, свабода, правы чалавека, бізнес, канкурэнцыя, прыватная ўласнасць.

## 2. Сутнасць і тыпы партыйных сістэм. Асаблівасці станаўлення партыйнай сістэмы ў Рэспубліке Беларусь

У працэсе сваёй дзейнасці палітычныя партыі ўступаюць ў пэўныя адносіны паміж сабою, а таксама з дзяржаваю і іншымі палітычнымі інстытутамі. У гэтым узаемадзеянні яны ўтвараюць партыйную сістэму.

**Партыйная сістэма** – аб'яднанне ўзаемазвязаных паміж сабою партый, якія імкнуцца да атрымання, утрымання і рэалізацыі ўлады, ці інакш кажучы, – сукупнасць існуючых у краіне партый і прынцыпаў узаемаадносін паміж імі.

Тры ***тыпы*** сістэм:

- аднапартыйныя (таталітарныя і сацыялістычныя рэжымы);
- двухпартыйныя (Вялікабрытанія, ЗША);
- шматпартыйныя (Італія, Літва, Польшча, ФРГ).

Характар і асаблівасці партыйнай сістэмы той ці іншай краіны абумоўлены шматлікімі фактарамі – раскладам сацыяльна-класавых сіл, ступенню палітычнай саспеласці грамадства, узроўнем палітычнай свядомасці і культуры, гістрычнымі традыцыямі, нацыянальным складам, рэлігійнай сітуацыяй і інш. Істотнае ўздзеянне на фарміраванне партыйнай сістэмы аказвае існуючае заканадаўства і перадусім выбарчыя законы.

Як сведчыць вопыт палітычнага развіцця, найлепшай формай і ўмоваю дэмакратычнага развіцця грамадства з'яўляюцца шматпартыйныя (двухпартыйныя) сістэмы. Іх выразнай асаблівацю з'яўляецца адсутнасць манаполіі на ўладу з боку адной партыі і існаванне рэальнай палітычнай апазіцыі.

### Асаблівасці станаўлення партыйнай сістэмы ў Рэспубліке Беларусь

Працэс стварэння і дзейнасці палітычных партый у нашай краіне рэгламентуецца Канстытуцыяй (Арт. 4,5), Законам аб палітычных партыях, дэкрэтам прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь № 2 (1999г.). У 1991 г. у Беларусі было 15 партый, 1995 г. – 34, 1998 – 46 і 1000 грамадскіх аб'яднанняў, 2000 г. – 18 партый.

На сённяшні дзень у Беларусі дзейнічаюць наступныя палітычныя партыі: Аб'яднаная грамадзянская партыя, Аграрная партыя, Беларуская партыя "Зялёныя", Беларуская партыя жанчын "Надзея", Беларуская партыя працы, Беларуская патрыятычная партыя, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя "Народная грамада", Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя, Беларуская экалагічная партыя "БЭЗ", Камуністычная партыя Беларусі,

Кансерватыўна-хрысціянская партыя "БНФ", Ліберальна-дэмакратычная партыя, Партыя Беларускага народнага фронта, Партыя камуністаў Беларуская, Партыя "Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада", Рэспубліканская партыя, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, Сацыял-дэмакратычная партыя народнай згоды.

Як адзначае палітолаг Я.Сапёлкін, беларускае грамадства знаходзіцца на шляху фарміравання шматпартыйнасці, якая развіваецца вельмі супярэчліва і мае свае асаблівасці. Па-першае, у Беларусі ствараецца не толькі новая палітычная сістэма, але і новыя эканамічныя адносіны. У сацыяльнай структуры грамадства пераважаюць залежныя ад дзяржавы работнікі. Колькасць уласнікаў вельмі невялікая. Пакуль што ў краіне адсутнічае паўнавартасная база для шматпартыйнасці. Па-другое, па колькаснаму складу большасць беларускіх палітычных партый малалікія. Прычыны гэтага розныя: недавер насельніцтва, перашкоды з боку ўладаў, страх людзей і г.д. Па-трэцяе, фарміраванне палітычных партый прыйшлося ў нашай краіне на перыяд татальнага крызісу грамадства, калі яшчэ не былі выяўлены інтарэсы і запатрабаванні сацыяльных груп, утварэнне партый апярэдзіла псіхалагічную падрыхтаванасць насельніцтва да ўсведамлення і ўспрыняцця перамен. На сёняшні дзень пераважная колькасць насельніцтва не ведае, якія партыі існуюць у дзяржаве, хіба за выключэннем БНФ і камуністаў.

Пры ўсёй адноснай шматвобразнасці партыйна-палітычнай палітры сённяшняга беларускага грамадства можна вызначыць тры групы палітычных партый:

а) ***партыі правага накірунку*** – у асноўным неаліберальнай, антыкамуністычнай і нацыянальна-патрыятычнай накіраванасці. Яны ў асноўным ставяць сваёй праграмнай мэтай развіццё Беларусі па заходнееўрапейскаму ўзору, захаванне незалежнасці і суверэнітэту. Гэта: КХП "БНФ, партыя БНФ, АГП;

б) ***дэмакратычныя партыі цэнтрысцкага характару***, якія выступаюць за сацыяльна-арыентаваную рыначную эканоміку, правядзенне рэформ пры моцнай сацыяльнай абароне насельніцтва з боку дзяржавы. Гэта: БСДП "Народная грамада", СДП народнай згоды і інш.;

в) ***партыі левага накірунку*** – камуністычнай, сацыялістычнай арыентаванасці: ПКБ, КПБ, РПТ і С і іншыя.

Нягледзячы на шматлікія перашкоды з боку афіцыйных уладаў, у Рэспубліке Беларусь паступова ідзе працэс станаўлення шматпартыйнасці.

Разам з партыямі істотную ролю ў жыцці грамадства іграюць грамадскія арганізацыі і рухі.

### 3. Грамадскія арганізацыі і грамадскія рухі

У наш час не ўсе інтарэсы людзей могуць быць рэалізаваны праз дзяржаўныя структуры і палітычныя партыі. Усё большую ролю ў рашэнні жыццёва значных праблем адыгрываюць сацыяльна-эканамічныя і сацыяльна-культурныя грамадскія арганізацыі.

Вопыт сведчыць, што найбольшую сацыяльную падтрымку сёння грамадзяне аказваюць грамадска-палітычным аб'яднанням і арганізацыям, а не палітычным партыям.

**Грамадская арганізацыя** – гэта добраахвотнае аб'яднанне грамадзян на аснове агульнасці інтарэсаў, маючае адносна ўстойлівую арганізацыйную структуру, фіксаванае асабістае ці калектыўнае сяброўства.

**Грамадскі рух** – сумесная дзейнасць грамадзян, якія імкнуцца да дасягнення пэўнай агульнай мэты, але не маюць акрэсленай арганізацыйнай структуры і фіксаванага сяброўства.

Асаблівасцю грамадскіх арганізацый і рухаў з'яўляецца тое, што ўдзельнічаючы ў палітычным жыцці, яны не імкнуцца авалодаць уладаю. Агульным для іх ёсць выкарыстоўванне розных спосабаў уплыву і ціску на ўладу.

***Прычыны ўзнікнення*** грамадска-палітычных арганізацый і рухаў: хуткае змяненне палітычнай, эканамічнай сітуацыі ў краіне; рэалізацыя запатрабаванняў чалавека ў грамадска-палітычнай дзейнасці; павышэнне ўзроўня інфарміравання грамадства; павышэнне ўзроўня адукаванасці насельніцтва; глабалізацыя эканомікі; узнікненне міжэтнічных супярэчнасцей.

Зыходзячы з розных прычын узнікнення сучасных грамадска-палітычных арганізацый і рухаў, палітолаг Я. Сапёлкін сгрупаваў іх згодна трох асноўных ***прыкмет***:

1) Арганізацыі непасрэднага ўплыву на палітычныя рашэнні пры дзяржаўных структурах: лабісты, групы ціску, якія аказваюць уздзеянні на дэпутатаў парламента.

2) Арганізацыі, для якіх палітычная дзейнасць не з'яўляецца асноўнай: прафсаюзы, пацыфісцкі рух, абаронцы навакольнага асяроддзя, саюзы прадпрыймальнікаў, спажывецкі рух і г.д.

3) Масавыя, стыхійныя рухі, якія маюць спантанную прыроду: несанкцыянаваныя мітынгі і дэманстрацыі, негатыўныя масавыя эмоцыі.

Характэрнымі рысамі грамадскіх рухаў сучаснасці з'яўляюцца: шматвобразнасць сацыяльнай базы, сацыяльных груп і іх інтарэсаў.

Тыпічным для ўдзельнікаў руху ёсць: адносна малады ўзрост, даволі высокі ўзровень адукацыі, крытычныя адносіны да існуючага парадку, накіраванасць на агульначалавечыя праблемы, арыентацыя супраць глабалізацыі.

На першым этапе мэтай грамадскіх рухаў часцяком з'яўляецца пратэст альбо крытыка дзеянняў урада. Іх дзейнасць мае неаднародны характар, уключае розныя сацыяльныя накірункі і адрозніваецца арганізацыйнай няўстойлівасцю. Невысокая культура арганізацыйнай работы і недастатковыя ўменні кансалідаваць удзельнікаў руху па-за экстрэмальнымі ўмовамі патрабуюць стварэнне ўстойлівых грамадскіх арганізацый.

Сучасныя грамадска-палітычныя і дэмакратычныя рухі бываюць:

а) у залежнасці ад мэтаў руху: антываенныя і антыядэрныя рухі, рухі недалучэння, выступленні супраць расавай і нацыянальнай дыскрымінацыі, праваабарончыя рухі, за ахову навакольнага асяроддзя;

б) згодна падыходаў і стылю дзейнасці: масавыя рухі, групавыя і элітныя, рэфарматарскія, рэвалюцыйныя, выкарыстоўваючыя гвалт, адмаўляючыя гвалт;

в) з улікам памераў руху: мясцовыя, рэгіянальныя, нацыянальныя, міжнародныя, глабальныя.

Грамадскія арганізацыі шматвобразныя па формах дзейнасці і арганізацыі. У наш час вылучаюць наступныя ***тыпы*** грамадскіх арганізацый:

- на грунце грамадска-палітычных інтарэсаў: праваабарончыя, міратворчыя, антываенныя, таварыствы сяброўства (дружбы);
- у залежнасці ад асаблівасцей полаўзроставых груп: маладзёжныя, ветэранскія, студэнцкія;
- на грунце эканамічных інтарэсаў: прафсаюзы, кааператыўныя арганізацыі, прадпрыймальніцкія саюзы;
- на сацыяльнай аснове: працоўных, сялян, буржуазіі, шляхецкія сходы;
- згодна творчых інтарэсаў: гісторыка-асветныя, навукова-тэхнічныя, саюзы пісьменнікаў, рухі вучоных, урачоў, юрыстаў;
- прыродаахоўныя: экалагічныя арганізацыі, аховы і аднаўлення гістарычных помнікаў.

Агульным для гэтых арганізацый і рухаў з'яўляецца тое, што яны даволі актыўна ўдзельнічаюць ў палітычным жыцці і прыкметна ўплываюць на палітыку дзяржавы. Грамадскія арганізацыі і рухі выконваюць ***функцыі***: выяўлення і задавальнення інтарэсаў і запатрабаванняў; сацыяльнай інтэграцыі і мабілізацыі; сацыяльныя; рэпрэзантатыўная; мадэліравання новых грамадскіх структур.

Яны адначасова выступаюць як своеасаблівыя групы інтарэсаў і групы ціску (уздзеянне на інстытуты публічнай улады).

***Формы і метады ціску*** на органы ўлады:

- непасрэднае вылучэнне сваіх кандыдатур у органы ўлады;
- падтрымка (фінансавая) на выбарах партый і кандыдатаў;
- удзел у распрацоўке заканадаўчых актаў;
- удзел у працы парламенцкіх камісій, экспертных груп і г.д.;
- арганізацыя прапагандысцкіх кампаній у СМІ, збор подпісаў;
- мітынгі, страйкі, пікеты, дэманстрацыі.

Асобая форма прадстаўніцтва і абароны групавых інтарэсаў – **лабізм** – гэта любыя законныя спосабы ўплыву (ціску) на дзяржаву з мэтай абароны асаблівых інтарэсаў.

У сучасным жыцці акрамя грамадскіх арганізацый існуюць культурна-творчыя арганізацыі (клубы самадзейнай песні, выканаўчыя музыкальныя групы і г.д.) і нефармальныя аб'яднанні на падставе шырокага кола мэтаў і інтарэсаў, з развіццём Інтэрнэта ствараюцца кампутарныя клубы і г.д.

У наш час назіраецца працэс памяншэння ўплыву палітычных партый на грамадскае жыццё і ўзрастае роля грамадска-палітычных арганізацый і рухаў.

## 4. Дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі

У 1999 годзе адбылася перарэгістрацыя ўсіх грамадскіх аб’яднанняў, у тым ліку і нацыянальных, у сувязі з Дэкрэтам Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь за № 2 ад 36.01.99г. “Аб некаторых мерах па ўпарадкаванню дзейнасці палітычных партый, прафесійных саюзаў, іншых грамадскіх аб’яднанняў”. У 2004 годзе ў Беларусі дзейнічалі 122 грамадскія арганізацыі і іх саюзы, якія прадстаўляюць 24 нацыянальныя супольнасці (дарэчы ў нашай дзяржаве стала жывуць 107,8 тыс. грамадзян іншых краін). Сярод арганізацый – 47 яўрэйскіх, 12 польскіх, 9 нямецкіх, па 8 рускіх і літоўскіх, па 5 азербайджанскіх, украінскіх і татарскіх, 3 армянскіх, 4 цыганскіх, па 2 грэчаскіх і грузінскіх. У Беларусі таксама былі і ёсць нацыянальныя арганізацыі арабаў, афганцаў, башкір, дагестанцаў, казахаў, карэйцаў, латышоў, малдаван, сірыйцаў, туркаў, чувашоў, эстонцаў.

Зроблены аналіз міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных аб’яднанняў наступных супольнасцей: рускіх, татар, палякаў, украінцаў, літоўцаў, цыган, азербайджанцаў, грузін, афганцаў, яўрэяў, немцаў, карэйцаў, грэкаў, казахаў, дазваляе пракаменціраваць статуты і вызначыць, у асноўным, агульныя тэндэнцыі ў накірунках дзейнасці нацыянальных грамадскіх аб’яднанняў у Беларусі.

Найбольш, 89,2% ад агульнай колькасці прааналізаванных, займаюцца захаваннем нацыянальных традыцый і прапагандай сваёй культуры, шляхам стварэння калектываў мастацкай самадзейнасці, правядзення канцэртаў, конкурсаў, фестывалей, выстаў і г.д. 78,4% – прадстаўляюць розныя інтарэсы сваіх сяброў (членаў) у дзяржаўных і іншых установах. 54,1% займаюцца (ці плануюць займацца) захаваннем і прапагандай помнікаў гісторыі і культуры свайго народа. 45,9% – паставілі перад сабою мэту нацыянальнага адраджэння і развіцця культуры, каб захаваць самастоеснасць і пазбегнуць асіміляцыі. 40,5% – збіраюцца адстойваць сацыяльныя і эканамічныя правы, абараняць і дапамагаць суайчыннікам. 37,8% – садзейнічаюць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. 32,4% абараняюць нацыянальныя і грамадзянскія правы, годнасць. 29,7% займаюцца праблемай адраджэння і развіцця роднай мовы, 21,6% – дабрачыннай дапамогай і ўшанаваннем памяці славутых асоб сваёй нацыянальнасці, ахвяр Халакосту і г.д. 18,9% – спрыяюць грамадскай актыўнасці асобам сваёй нацыянальнасці, даюць магчымасць для самарэалізацыі, раскрыцця свайго творчага патэнцыялу. Такі ж працэнт грамадскіх аб’яднанняў займаецца асветніцкай і адукацыйнай дзейнасцю (стварэннем нацыянальных школ, класаў па вывучэнню роднай мовы і г.д.). 16,2% імкнуцца да стварэння сваіх нацыянальных цэнтраў, каардынацыі намаганняў у справе захавання нацыянальнай саматоеснасці. 16,2% спрыяюць вывучэнню ўласнай гісторыі, займаюцца навуковай і даследчыцкай дзейнасцю, 13,5% – выдавецкай дзейнасцю (газеты “Истоки”, “Głos znad Niemna”, часопіс “Мишпоха” і інш.). 5,4% садзейнічаюць грамадзянскай самасвядомасці. 5,4% выступаюць за інтэграцыю з іншымі краінамі, 5,4% выхоўваюць пачуццё сваёй уласнай нацыянальнай выключнасці. 2,7% імкнуцца змагацца з шавінізмам і нацыяналізмам і столькі ж плануюць, для выканання статутных мэтаў і задач, выкарыстоўваць актыўныя метады грамадскіх дзеянняў: мітынгі, маніфестацыі, масавыя акцыі і г.д.

Мэты і праграмныя накірункі дзейнасці, канкрэтная праца па іх рэалізацыі некаторых аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі дазваляе пабачыць іх грамадскае і культурнае жыццё.

Адным з першых у Беларусі было зарэгістравана аддзелам культуры Мінгарвыканкама ў лютым 1990 г. таварыства "Палонія". У тым жа годзе быў утвораны Саюз палякаў Беларусі (СПБ). Самае масавае нацыянальнае грамадскае аб'яднанне ставіць перад сабою мэты нацыянальнага адраджэння, фарміравання нацыянальнай самасвядомасці, грамадскай актыўнасці палякаў Беларусі, абароны іх нацыянальных і грамадзянскіх правоў, выяўлення патрэб і праблем, абуджэння грамадзянскай самасвядомасці польскага насельніцтва Беларусі ў грамадскім жыцці, супрацьдзеяння шавінізму і нацыяналізму, развіццю патрыятызму і інш. З самага пачатку члены Саюза паводзілі сябе вельмі актыўна. Яны пісалі петыцыі, выстаўлялі пікеты каля абл- і райвыканкамаў, настойлівалі на сваіх патрабаваннях. Іх намаганнямі ў Лідзе быў пастаўлены помнік А.Міцкевічу, у Вілейке – памятнік легіянерам Ю.Пілсудскага. Прыкладаліcь намаганні аб'яднаць дэпутатаў–палякаў у Вярхоўным Савеце 12 склікання (іх было каля 30), але з гэтага нічога не атрымалася.

Саюз Палякаў на Беларусі быў перарэгістраваны 29 чэрвеня 1997 года Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь. У студзені 1998 года на тэрыторыі Беларусі меліся: Дамы Паляка (у якасці матэрыяльнай базы СПБ) у Гродна, Лідзе, Магілёве, Баранавічах, Браславе, Шчучыне, Ашмянах, в. Камелішкі Астравецкага раёна, г.п. Поразава, в. Вішнява Валожынскага раёна; польскія бібліятэкі ў Гродна, Лідзе, Ваўкавыску, Навагрудку, Ашмянах, в. Кемелішках, Мінске, Магілёве, Віцебске, Браславе, Шчучыне, Баранавічах, Поразаве, в. Вішнява.

У 1998 годзе грамадскае аб'яднанне мела структуры у 6 абласцях, 51 раёне, 150 вясковых мясцовасцях, налічвала каля 30 тысяч членаў. СПБ аб'ядноўваў 65 польскіх самадзейных калектываў (з іх 40 у Гродзенскай вобласці): хары, вакальныя групы, ансамблі спеваў і танцаў, танцавальныя калектывы, вакальна–інструментальныя ансамблі, фальклёрныя групы. У 1997 годзе быў заснаваны ў Гродна польскі тэатр (кіраўнік В.Сілкін). Вопратку для калектываў шылі за ўласны кошт, толькі ансамблю спеваў і танцу "Ютшэнка" г. Ваўкавыска пашыў фінансаваў Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур. У 1997–1998 гг. СПБ ініцыіраваў справу аб прызнанні ветэранамі вайны грамадзян Беларусі, якія служылі ў фарімараваннях Арміі Краёвай. Саюз палякаў неаднаразова звяртаўся ў Навагрудскі райвыканкам з прапановамі дапамогі ўладам у справе фінансавання пабудовы польскай школы ў Навагрудку.

Пад эгідай ГА СПБ дзейнічаюць больш дзесяці структур, у тым ліку: маладзёжныя, студэнцкія, польскае навуковае таварыства, Таварыства польскіх гісторыкаў, Таварыства медыцынскіх сясцёр і акушэраў, Таварыства народных майстроў, Таварыства польскіх мастакоў, Польскае таварыства ўрачоў на Гродзеншчыне, Таварыства жаўнераў Арміі Краёвай, Таварыства польскіх ветэранаў, Таварыства палякаў – ахвяр палітычных рэпрэсій, Спартыўны клуб "Баторы", Гандлёва– прамысловая палата, камітэты памяці А.Міцкевіча і Э.Ажэшка і інш. "Саюз польскага харцарства на Беларусі", які дзейнічае пры СПБ, ставіць сваёй асноўнай задачай – выхаванне грамадзянскай пазіцыі ў

маладога пакалення, пачуцця клопату і адказнасці за лёс сваёй дзяржавы – Беларусі. Пры СПБ таксама дзейнічае рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне "Мацер школьная" (спецыялізіруецца на адукацыйных праграмах). ГА СПБ мае ўласны друкаваны орган – штотыднёвую газету "Głos znad Niemna".

23 чэрвеня 1991 года на свяце Курбан–Байрам у Іуі, дзе прысутнічалі шматлікія пасланцы з усіх раёнаў і абласцей Беларусі, было вырашана стварыць рэспубліканскае згуртаванне татар–мусульман на Беларусі "Аль–Кітаб".

Напрыканцы 1993 г. была створана і зарэгістравана палітычная партыя – Польскае дэмакратычнае аб'яднанне (ПДА). У яе дакументах былі вызначаны наступныя задачы партыі: дэмакратызацыя, рэфарміраванне грамадства; умацаванне незалежнасці Беларусі, стварэнне спрыяльных умоў жыцця насельніцтву, асабліва нацыянальным меншасцям, у тым ліку і палякам. У 1994 годзе ў барацьбу за пост прэзідэнта ўключаўся старшыня ПДА Э.Ахрэм, які не сабраў неабходную колькасць подпісаў грамадзян для сваёй рэгістрацыі ў якасці кандыдата. У ходзе перарэгістрацыі партый і грамадскіх аб'яднанняў у 1995 г. ПДА не стала перарэгістроўвацца і знікла з палітычнай арэны.

27 кастрычніка 1997 года ў Беларусі быў зарэгістраваны статут Кангрэса Палякаў. З статута бачна, што асноўнымі мэтамі гэтага нацыянальнага аб'яднання былі: каардынацыя дзейнасці і ўсялякае садзейнічанне развіццю арганізацый, якія павінны былі ўваходзіць у склад Кангрэса; абарона нацыянальных і грамадзянскіх правоў палякаў, якія жылі ў Рэспубліке Беларусь; нацыянальнае адраджэнне, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, садзейнічанне грамадскаму пад'ёму палякаў Беларусі; адраджэнне польскай мовы, польскамоўнай адукацыі; адраджэнне і развіццё польскай культуры і польскіх традыцый сярод палякаў Беларусі. Кангрэс палякаў ставіў перад сабой задачы: абуджэння грамадзянскай самасвядомасці польскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь у грамадска–палітычным і эканамічным жыцці; выхавання патрыятызму і павагі да гісторыі і г.д. Такім чынам, можна адзначыць, што гэтае аб'яднанне ставіла перад сабою мэты актыўнага ўдзелу ў грамадска–палітычным жыцці нашай дзяржавы і як вынік - на 01.01.2004 г. Кангрэс Палякаў не значыцца ў спісе афіцыйна зарэгістраваных уладамі аб'яднанняў нацыянальных супольнасцей Беларусі.

У адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь на пачатак 2005 года органамі юстыцыі былі зарэгістраваны 8 грамадскіх аб'яднанняў, створаных польскай грамадскасцю Беларусі. У рэспубліцы на польскай мове выдаюцца 4 газеты і 2 часопіса, вядзецца выкладанне ў школах і спецыялізаваных класах. Згодна афіцыйных дадзеных у 2004 годзе на ўтрыманне школ і класаў з польскай мовай навучанне было выдаткавана 731,424 млн рублёў (335515, 59 даляраў ЗША).

У 2005 годзе польскую нацыянальную супольнасць у прадстаўнічых і заканадаўчых органах Беларусі прадстаўлялі 687 (21,6% ад агульнай колькасці) дэпутатаў мясцовых саветаў, па 2 – у Палаце прадстаўнікоў і Савеце Рэспублікі.

За грамадзянскія правы выступаюць грамадскія аб'яднанні немцаў "Айнтрахт" (г. Ліда), грэкаў "Пелапанэс", азербайджанцаў "Хазар", грузінаў "Іберыя", цыган (г. Ашмяны).

ГА “Беларуская цыганская дыяспара” паставіла перад сабою мэты – дамагацца кампенсацыі ахвярам Халакоста, забяспячэнне сацыяльнага статуса і працаўладкавання ромскага насельніцтва, юрыдычнай абароны цыган і вырашэння праблем крымінальнай сітуацыі ў цыганскім асяродку і інш. Варта адзначыць, што падчас перапісу насельніцтва 1999 года 77,5% цыган назвалі сваёй нацыянальнай мовай цыганскую (гэта другая пазіцыя пасля беларусаў). У Мінску зарэгістраваны і дзейнічаюць 1 міжнароднае і 2 рэспубліканскіх грамадскіх аб’яднання цыган, у г.п. Ашмяны – раённае. Згодна інфармацыі ГА “Беларуская цыганская дыяспара” тры прадстаўніка цыганскай нацыянальнасці вылучаліся ў Палату прадстаўнікоў і мясцовыя саветы. У снежні 2004 года выйшаў першы нумар інфармацыйнага бюлетэня ГА “Беларуская цыганская дыяспара” пад назвай “Романолав” (“Цыганскае слова”). У нашай дзяржаве добра вядомы ансамблі цыган (2004г.): “Джана Рома” з Ашмян, “Тэрнэ Бэрша” з Магілёва, “Гіля Ромэн” з Лельчыц і іншыя.

Найбуйнейшая этнічная група Беларусі прадстаўлена рускімі. У сацыяльна–палітычным і нацыянальным аспектах рускаму насельніцтву адкрыты шырокія магчымасці і перспектывы для рэалізацыі этнічных і моўна–культурных патрэб. Руская мова з’яўляецца другой дзяржаўнай мовай Рэспублікі Беларусь. У краіну паступае расійская прэса, выходзяць мясцовыя рускамоўныя выданні, існуюць тэатры, на рускай мове вядуцца праграмы радыё і тэлебачання, ажыццяўляецца навучанне ў школах і ВНУ. Зарэгістраваны і дзейнічаюць грамадскія аб’яднанні, якія аб’ядноўваюць асоб рускай нацыянальнасці. Найбуйнейшае – “Рускае таварыства”, якое ставіць мэтай захаванне і прапаганду рускай культуры.

За інтэграцыю з іншымі дзяржавамі і выхаванне ўласнай нацыянальнай выключнасці выступаюць пра–славянскія і некаторыя рускія яб’яднанні, як афіцыйна зарэгістраваныя, так і не прайшоўшыя рэгістрацыю. Так, у статуце ГА “Паслы славянства” былі зафіксаваны наступныя задачы: інтэграцыя з Расіяй; распаўсюджванне праўдзівай інфармацыі аб славянскай культуры; падтрымка дзеячоў культуры, якія падвергліся нападу за абарону нацыянальнай (чытай рускай) культуры і г.д. Мэты і задачы Віцебскага ГА “Руская абшчына” яшчэ болей красамоўныя, якія добра бачны, як з выказванняў іх лідараў, так і з праграмных артыкулаў, якія былі надрукаваны ў газеце “Истоки”. Апошняя выдаецца на сродкі Віцебскага грамадскага аб’яднання “Руская абшчына”. Газета была зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь (Пасв. № 2092 ад 19.06.2003г.).

Лідар ВГА “Руская абшчына” А.У.Краўцоў на старонках газеты ў артыкуле “Мы ставим цель” размясціў праграмныя мэты рускіх абшчын: “...воспитание у русских, белорусов и украинцев чувства принадлежности к единому и неделимому русскому народу; воспитание русского патриотизма – каждый русский человек должен помнить, что его поле Куликово – та русская земля, на которой он живёт ...пропаганда достижений нашей общерусской культуры; осознание подлинного величия русского народа как последнего оплота добра и справедливости, противостоящего мировому злу; ...воспитание чувства ответственности у русских людей за всю Русскую землю и за каждого русского человека; ...осознание происходящего геноцида людей русской национальности...”

Праявы нацыянальнага экстрэмізму заўважаліся і ў дзейнасці некаторых украінскіх аб'яднанняў. Кіраўніцтва грамадскага аб'яднання "Прасвіта Берасцейшчыны" імя Т.Шаўчэнкі, Украінскага грамадска-культурнага аб'яднання Брэсцкай вобласці, рэдакцый газет "Берасцейскі край" і "Голас Берасцейшчыны" неаднаразова бяздоказна абвінавачвалі ў надрукаваных матэрыялах Рэспубліку Беларусь у прымусовай асіміляцыі і дыскрымінацыі украінцаў, тым самым ствараючы падставы для ўзнікнення міжнацыянальнай напружанасці. Спецыялісты Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (КСРН) адзначалі, што з боку асобных украінскіх аб'яднанняў гучалі зняважлівыя выказванні наконт тытульнага этнасу-беларусаў, іх мовы, заклікі да перагляду дзяржаўных межаў.

Аб гэтым сведчаць наступныя факты. Так, у № 6 (6) за 1996 год газеты "Берасцейскі край" сцвярджалася, што ў Беларусі "вядзецца антыукраінская кампанія". У № 1 (10) за 1997 год была выказана думка, што "тэрыторыя Брэсцкай вобласці незаконна ўвайшла ў склад БССР". На старонках газеты адзначалася, што: "…у Беларусі пражывае звыш 1 млн. украінцаў", "…Берасцейшчына – этнічна ўкраінская зямля" (№30 (39)), "…Берасцейшчына заселена этнічнымі ўкраінцамі" (№ 33 (42)), "…паўсюль у сельскай мясцовасці Брэсцкай вобласці людзі размаўляюць на ўкраінскай мове", "…украінцы не могуць без праблемаў чытаць украінскую прэсу, нармальна вучыць дзяцей у ўкраінскіх школах" (№ 34 (43)), "…практычна з пасляваеннага часу да сёння ідзе метадычная паступовая работа па асіміляцыі народу ўкраінскай Берасцейшчыны" (№ 36 (45), 13.09.97г.). Ініцыятары ўкраінскага руху Брэсцкай вобласці заяўлялі аб пачатку складання "негатыўнага рэестру" тых асобаў, якія выказвалі ці выказваюць сваю нязгоду са спробамі ўкраінізацыі Берасцейшчыны. Гэта справа распачалася на старонках, створанага ў 1996 годзе, "Слоўніка Берасцейшчыны" (аўтар В.Леанюк). У ім Берасцейшчына названа "украінскім краем", а на 6 старонцы змешчана наступнае: "мы павінны знайсці і памятаць ненавіснікаў украінства палескага... у такім памеры ведаць як ведаем нацыянальных герояў, светлых патрыётаў".

Дзіўным, калі не сказаць антыбеларускім, выглядае выступ кіраўніка Маларыцкага філіялу ГА "Прасвіта Берасцейшчыны" В.Харсюка на II Сусветным форуме ўкраінцаў. У сваёй прамове, сярод іншага, ён сцвярджаў: "Наша беларуская дзяржава стараецца скрыць нацыянальную прыналежнасць палескага народу, варожа ставіцца да тых, хто дамагаецца засвядоміць палешукоў, што яны ёсць украінцы, а не якая-небудзь там невядомая мешаніна, мужыкі і гавораць па-маларыцкі, ці па-мясцоваму". В.Харсюк звярнуўся наконт Берасцейшчыны да ўкраінскага кіраўніцтва, якое знаходзілася на форуме, з запытам - "чаму яно, маўляў, не ведае дзе праўдзівая ўкраінская мяжа".

Кіраўніцтва ГА "Прасвіта" на старонках газеты "Берасцейскі край" дазваляла сабе ні ў чым не апраўданыя выказванні ў бок беларусаў: "Спробы беларусізацыі края па сваёй маральнасці нічым не адрозніваюцца ад спробаў русіфікацыі і паланізацыі" (№ 37 (46), 20.09.97г.). Кіраўнік праўлення аб'яднання "Прасвіта" А.Пархач на сустрэчы з украінскімі дыпламатамі заявіў: "Беларускія вучоныя ігнаруюць навуковае абгрунтаванне вывучэння мовы палескага рэгіёну, беспадстаўна залічваючы гаворкі нашага люду да беларускай мовы" (№ 39 (48),

01.11.97г.). Ён жа на старонках газеты сцвярджаў, што "ідэя агульнага Беларускага Дома і Беларускай Дзяржавы – ідэалагічна штучная". У той жа час, кіраўніцтва ГА "Прасвіта" у сваіх лістах да Дзяржаўнага камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей адзначна трактавала гэтую ідэю "як вельмі добрую". Не на карысць узаемаразумення і згоды наступныя выказванні: "хвароба беларускага песнякрадства не ведае дзяржаўных межаў", "у песнях Берасцейшчыны немагчыма знайсці ніводнага сапраўднага беларускага слова" (№ 40 (49), 08.11.97г.). Дарэчы, варожа ставілася кіраўніцтва ГА "Прасвіта" і да сваіх, нязгодных у чымсці з імі. Напрыклад, да Беларускай асацыяцыі ўкраінцаў "Ватра".

З 1995 года бярэ пачатак дзейнасць ГА "Цэнтр украінскай культуры "Січ" (перарэгістраваны ў 1999 г.) у г. Мінску. Кіраўнік – Логвін В.П.

Аб'яднанне было ўтворана з мэтай – садзейнічаць захаванню і развіццю ўкраінскай культуры, самаідэнтыфікацыі ўкраінскага этнаса ў Рэспубліке Беларусь, фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, гістарычнай памяці, стварэнню ўмоў для нацыянальна–культурнага развіцця.

Пры цэнтры "Січ" дзейнічае хор украінскай песьні "Крыніца" (з 1998 г. мае званне народнага), да 2002 г. існаваў дзіцячы танцавальны ансамбль, да 2001 г. функцыяніравалі школа выхаднога дня і "Клуб сяброў Украіны".

ГА "Цэнтр украінскай культуры "Січ" правёў у 1999, 2002 гг. V і VI рэспубліканскія фестывалі мастацтваў украінцаў Беларусі. Сябры цэнтра прымалі ўдзел у правядзенні года Т.Шаўчэнкі ў Беларусі і "Дзён Кіева" у 2002–2003 гг., ва ўсіх рэспубліканкіх фестывалях нацыянальных культур Беларусі, прычым хор "Крыніца" у 2000 г. атрымаў званне лаурэата.

У 1996 годзе быў утвораны ў г. Брэсце Украінскі навукова–педагагічны саюз Беларусі "Берагіня" (перарэгістраваны ў 1999 годзе 6 кастрычніка). Кіраўнік – Дарашко Л.С.

Мэта аб'яднання – яднанне педагагічных, навуковых і культурных дзеячоў Беларусі ў справе развіцця сістэмы ўкраінскай адукацыі, вывучэння ўкраінскай мовы, культуры, народнай творчасці і нацыянальных традыцый ураінцаў. Пры аб'яднанні дзейнічаюць: Украінскі студэнцкі эксперыментальны тэатр "Арт – Майдан", турыстычны клуб "Энергія".

Да найбольш значных мерапрыемстваў "Берагіні" за 1999–2004 гады варта аднесці: штогадовыя Шаўчэнкаўскія чытанні; правядзенне экскурсіі на Тарасаву гару (г. Канеў, 2000 г.); арганізацыя і правядзенне штогадовых турыстычных вандровак (Карпаты, Крым); штогадовыя тэатральныя вечары; падрыхтоўка і выданне вучэбных дапаможнікаў – Дорошко Л.С. Початковий курс української мови. Фонетика.– Брест, 2000; Дорошко Л.С. Практичний курс української мови (Лексика).–Брест, 2004.

З мая 1994 г. у рэспубліцы дзейнічае Абшчына беларускіх літоўцаў. Асноўнымі мэтамі таварыства з'яўляюцца пашырэнне сувязяў паміж народамі Беларусі і Літвы, захаванне гістарычнай памяці, культуры, нацыянальнай самасвядомасці, мовы і звычаяў сярод літоўскага насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

У вёсцы Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці вялося будаўніцтва Літоўскага нацыянальнага культурнага цэнтра на сродкі Літвы. Заказчыкам будаўніцтва было Рэспубліканскае ГА “Беларуская абшчына літоўцаў”. У 1996 годзе было завершана будаўніцтва школы, 7 дамоў для настаўнікаў; 1997г.- пабудаваны інтэрнат на 70 месц, сталоўка, дзіцячы сад; 1998г. – кацельная, зроблена ацяпленне. У 2000 годзе было завершана будаўніцтва дома культуры.

У красавіку 1991 г. з мэтай адраджэння яўрэяў Рэспублікі Беларусь як нацыянальнай, так і культурнай супольнасці, іх кансалідацыі было створана Беларускае аб'яднанне яўрэйскіх арганізацый і абшчын (БАЯАА). У аб'яднанне увайшло звыш 135 арганізацый і суполак з 16 гарадоў краіны. За час свайго існавання аб’яднаннем адкрыты 14 нядзельных школ па вывучэнню мовы і культуры яўрэйскага народа, дзве агульнаадукацыйныя школы (у Мінску і Магілёве). Намаганнямі таварыства выдаецца 4 яўрэйскія газеты і спецыяльная газета для моладзі. Адкрыты яўрэйскі народны ўніверсітэт. У Мінску і Магілёве працуюць дзіцячыя садкі.

У Беларусі працуюць дабрачынныя цэнтры “Хэсэд–Рахамім” (Мінск), “Хэсэд–Раха” (Віцебск), “Хэсэд–Бацiя” (Гомель), “Хэсэд–Барух ”(Магілеў), а таксама асобныя группы міласэрнасці (Барысаў, Ліда, Мазыр, Орша, Рэчыца, Брэст і інш.). Першая группа міласэрнасці ў рэспубліке ўзнікла ў Мінскім гарадскім аб’яднанні яўрэйскай культуры ў 1989 годзе. Актывісты гэтай групы аказвалі дапамогу адзінокім яўрэям і ляжачым інвалідам усіх нацыянальнасцей, якія знаходзіліся ў Доме інвалідаў (Дражня). З дапамогаю Джойнта на аснове гэтай группы ў 1991г. была спачатку створана дабрачынная арганізацыя “Рахамім”, затым пераўтвораная ў лютым 1995 года ў цэнтр “Хэсэд–Рахамім” (дырэктар – С.Абрамава). Асноўная праца цэнтра робіцца добраахвотнікамі (валанцёрамі). Створана шырокая сетка патранажнай службы. Сярод накірункаў дзейнасці – пракат медыцынскага абсталявання, дапамога адзінокім у быту, прыбіранне кватэр, дагляд за хворымі, абеды на даму, паслугі цырульніка, дробны рамонт, медыцынскія кансультацыі ўрачоў – спецыялістаў, размеркаванне лекаў, праца клубаў і гурткоў па інтарэсах, вывучэнне традыцый, правядзенне святаў і інш.

Згодна інфармацыйнай даведкі аб Міжнародным грамадскім аб’яднанні дагестанцаў “Очаг” (старшыня праўлення Х.Г.Асадулаеў), аб’яднанне было зарэгістравана ў Рэспубліке Беларусь 5.09.2002 года (рэг. № 01125). У склад аб’яднання у Беларусі ўваходзіць каля 300 чалавек, сярод якіх прафесары, дацэнты, дактары навук (эканомікі, медыцыны), кандыдаты навук (філолаг і філосаф); прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі – вядомыя мастакі і музыканты; спартсмены – прызёры Алімпійскіх гульняў, чэмпіёны свету, Еўропы і Беларусі; дзяржаўныя служачыя, кіраўнікі прадпрыемстваў і бізнесмены.

Неабходна ведаць, што грамадскія аб’яднанні нацыянальных супольнасцей Беларусі не толькі спажыўцы з “кішэні” падаткаплацельшчыкаў альбо краін сваёй этнічнай радзімы. Яўрэйскія, польскія, нямецкія і іншыя аб’яднанні аказвалі неаднаразова гуманітарную дапамогу дзяржаўным установам, інтэрнатам Беларусі. Напрыклад, пасля правядзення фестывалю “Усходні слодыч” значныя

сродкі былі пералічаны інтэрнатам Мінска, на пабудову Нацыянальнай бібліятэкі; грамадскае аб’яднанне немцаў з Бабруйска падаравала аргтэхніку савету па справах рэлігій і нацыянальнасцей Магілёўскага аблвыканкама і інш.

Неабходна адзначыць, што амаль усе мерапрыемствы, якія праводзіліся і праводзяцца грамадскімі аб’яднаннямі нацыянальных супольнасцей Беларусі ў асноўным культурна–асветніцкага накірунку.

Статуты значнай часткі грамадскіх аб’яднанняў падобныя з пункту гледжання мэт і задач. У асноўным яны плануюць культурна–асветніцкую дзейнасць, захаванне традыцый свайго народа, прапаганду культуры, вывучэнне гісторыі. Усё гэта павінна спрыяць адраджэнню і фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Заканадаўства Беларусі пацiху звяло грамадскія аб’яднанні да статусу клубаў па інтарэсах, дазваляючы ў статутах прадугледжваць і адстойваць інтарэсы толькі членаў аб’яднання, а не ўсіх асоб пэўнай нацыянальнасці.

Аб’яднанні маюць статус грамадскіх і, натуральна, гэта абавязвае іх займацца грамадскай дзейнасцю не толькі ў галіне мастацтва. Нягледзячы на тое, што не ва ўсіх статутах маюцца накірункі развіцця грамадзянскай актыўнасці, абароны нацыянальных і грамадзянскіх праў, абароны нацыянальнай годнасці і самасвядомасці і г.д., шэраг аб’яднанняў займаецца падобнай дзейнасцю. Так у сакавіку 2005 года ў Магілёве была створана Каардынацыйная Рада грамадскіх і нацыянальных аб’яднанняў, палітычных партый і прафсаюзных арганізацый горада. Мэтай яе стварэння была каардынацыя дзеянняў грамадскіх аб’яднанняў, выпрацоўка прапаноў для органаў дзяржаўнай улады, мясцовага самакіравання, прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый наконт развіцця сацыяльнай і грамадскай актыўнасці грамадзян. У склад бюро Рады ўвайшлі прадстаўнікі 7 грамадскіх аб’яднанняў і палітычных партый. Старшынёй Рады стаў У.Шэлектар, старшыня грамадскага аб’яднання “Магілёўская яўрэйская абшчына”.

Аналіз грамадска–палітычнага і культурна–асветніцкага жыцця Рэспублікі Беларусь дазваляе ўбачыць, што прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей адыгрываюць значную ролю ў дзейнасці грамадскіх аб’яднанняў, уладных структур, навуковых, культурна–асветных устаноў Беларусі, аказваюць значны ўплыў на развіццё грамадскага і культурнага жыцця рэспублікі. Прадстаўнікі нацыянальных супольнасцей Беларусі займаюць высокія статусныя пазіцыі ў сацыяльнай структуры, эканоміцы, палітыцы і культуры беларускага грамадства. Прычым, у пэўных выпадках яны адыгрываюць больш адчувальную ролю ў грамадска–палітычным і гаспадарчым жыцці Беларусі, нярэдка нават большую, чым карэннае насельніцтва. Можна сцвярджаць, што сярод нацыянальных супольнасцей найлепш палітычна і культурна арганізаваным з’яўляецца польскае, яўрэйскае, украінскае насельніцтва. Яно больш актыўна ўключаецца ў новыя грамадска–палітычныя працэсы. Латышскае, літоўскае, нямецкае, рускае, цыганскае насельніцтва больш пасіўна, часцяком актывізуючы працу пры ўмовах фінансавання з боку.

Дзякуючы эфектыўнай дзейнасці нацыянальных супольнасцей, іх грамадскіх аб’яднанняў, будзе забяспечана адна з галоўных умоў працякання натуральных працэсаў сацыяльных змен – заахвочванне рэгіянальных і

нацыянальна–культурных аб’яднанняў, падтрымка нацыянальных дзяржаў і ўтварэнняў, нацыянальных культур і традыцый.

## ЛЕКЦЫЯ 9. ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ: СУТНАСЦЬ І СТРУКТУРА

1. Сутнасць і структура палітычнага працэса.
2. Суб'ектыўнае і аб'ектыўнае ў палітычным працэсе.
3. Фазы палітычнага працэсу.

Паліталогія вывучае не толькі палітычныя інстытуты, але і працэсы выпрацоўкі і прыняцця палітычных рашэнняў, узаемадзеянняў урада, парламента, партый і іншых палітычных сіл. Даследуюцца прычыны ўзнікнення той ці іншай палітычнай праблемы, як гэта праблема становіцца актуальнай (трапляе ў павестку дня – С.Рашэтнікаў) для грамадства, як на яе рэагуюць інстытуты кіравання, якія рашэнні прынімаюцца для яе вырашэння. Размова ідзе аб палітычнай практыцы, арганізацыйнай і кантрольнай дзейнасці, канкрэтным кіраванні, падборы і растаноўцы кадраў, абмеркаванні і прыняцці рашэнняў, абмену інфармацыяй паміж суб'ектамі палітычнага працэса і іншым. А гэта і ёсць палітычны працэс, які фарміруецца і накіроўваецца найперш тымі, хто знаходзіцца пры ўладзе, прынімае асноўныя палітычныя рашэнні.

### 1. Сутнасць і структура палітычнага працэса

Палітычны працэс непарыўна злучаны з мінулым і накіраваны ў будучае, нягледзячы на тое, што здзяйсняецца цяпер. Ён адлюстроўвае палітычную рэальнасць, якая фарміруецца не па жаданню лідараў і распрацовак вучоных, а з'яўляецца вынікам скрыжаванняў, барацьбы інтарэсаў розных палітычных сіл, сацыяльных груп, паводзін гэтых груп і грамадзян, іх уяўленняў аб тым, што яны хацелі б атрымаць ад урада і дзяржавы.

Як адзначае палітолаг С. Рашэтнікаў, палітычны працэс стымулюе сацыяльныя перамены. У працэсе сваёй дзейнасці людзі ўплываюць на палітычную сістэму грамадства, ствараюць адны яе элементы і разбураюць іншыя, падтрымлівюць пэўныя палітычныя сілы і прыводзяць іх да ўлады, адмаўляючы ў даверы іншым. Тым самым фарміруецца дзяржаўная палітыка, адлюстроўваючая запатрабаванні тых ці іншых сацыяльных груп. Палітычны працэс выступае як вынік узаемаўплыву груп, як дзеянні ўраду і іх уплыў на стан грамадства.

**Палітычны працэс** – гэта сукупная дзейнасць суб'ектаў, шляхам якой адбываецца фарміраванне, змяненне, пераўтварэнне і функцыяніраванне палітычнай сістэмы грамадства. Палітычны працэс – гэта тэхналогія ўвасаблення ўлады.

Змест палітычнага працэса можа быць розным: распрацоўка якой-небудзь канцэпцыі, фарміраванне грамадскай думкі, стварэнне новых кіруючых структур, правядзенне выбараў і г.д.

Складаецца з наступных ***элементаў***:

- суб'екта, носьбіта ўлады;

- аб'екта, які павінен быць створаны альбо дасягнуты як мэта працэса;

- сродкаў, метадаў, рэсурсаў, выканаўцаў працэса.

Рэсурсамі бываюць веды, навука, тэхнічныя і фінансавыя сродкі, настроі мас, ідэалогія, грамадская думка і іншыя фактары.

а) глабальныя міжнародныя адносіны – гэта адносіны паміж сістэмамі дзяржаў, буйнейшымі дзяржавамі і яны адлюстроўваюць сусветны палітычны працэс;

б) рэгіянальныя (субрэгіянальныя) адносіны – гэта адносіны паміж дзяржавамі пэўнага палітычнага рэгіёна ва ўсіх сферах жыццядзейнасці грамадства, маючыя больш канкрэтныя праявы і шматбаковы характар;

в) адносіны канкрэтнай міжнародна-палітычнай сітуацыі бываюць differ рознабаковымі, але заўжды маюць канкрэтна-гістарычны характар; гэта розныя тыпы адносін, магчыма нават некалькіх дзяржаў, якія зацікаўлены ў тым ці іншым вырашэнні пэўнай сітуацыі. Як толькі вырашаецца праблема – будзе пераадолена сітуацыя, склаўшыяся адносіны распадаюцца.

***Па гарызанталі*:**

а) групавыя (кааліцыйныя, міжкааліцыйныя) адносіны, якія рэалізюцца праз узаемаадносіны груп дзяржаў, міжнародных арганізацый і г.д.;

б) двухбаковыя адносіны – найбольш распаўсюджаная форма міжнародных адносін паміж дзяржавамі і арганізацыямі.

Для разумення сутнасці сістэмы міжнародных адносін, як адзначае доктар палітычных навук, прафесар С.Рашэтнікаў, вялікую значнасць мае вызначэнне суб'ектаў міжнародных адносін, да якіх адносяцца: класы і іншыя сацыяльныя групы; дзяржавы і дзяржаўныя аб'яднанні; палітычныя партыі; недзяржаўныя міжнародныя арганізацыі.

Галоўную значнасць мае дзяржава, як фактар, які вызначае ўсе астатнія элементы сістэмы, г.зн. яна валодае палітычнай уладай і матэрыяльнымі магчымасцямі, эканамічным і навукова-тэхнічным патэнцыялам, ваеннай моцай і іншымі сродкамі ўздзеяння. Іншыя суб'екты сістэмы міжнародных адносін маюць меншую значнасць для змен сутнасці гэтай сістэмы. Яны адыгрываюць хутчэй другасную (дапаможную) ролю. Аднак, пры пэўных умовах аказываюць і вырашальнае значэнне на ўсю сістэму.

На думку палітолага Я.Сапёлкіна, міжнародныя адносіны магчыма класіфікаваць, зыходзячы з практычных дзеянняў суб'ектаў сусветнай палітыкі, якія закранаюць лёсы чалавецтва.

***I тып*** – класічны, які грунтуецца на раўнавазе сіл;

***II тып*** – "халодная вайна", калі палітыка-дыпламатычная сфера аносін звужаецца за кошт пашырэння ваеннай;

***III тып*** – мірнае суіснаванне, якое характарызуецца глабальным падзелам свету на розны групавы грамадскі лад;

***IV тып*** – недалучэнне, калі захоўваецца свабода выбару рашэнняў і дзеянняў у міжнародных адносінах на грунце ўласнага інтарэсу;

***V тып*** – партнёрства, калі прыярытэтнымі з'яўляюцца агульначалавечыя інтарэсы, а барацьба за раззбраенне – усеагульнай.

У гэтай класіфікацыі асноўным крытэрыем падыходу да праблемы міжнародных адносін зя'уляецца катэгорыя інтарэсу, якая грунтуецца на агульначалавечых каштоўнасцях. Для асобна ўзятай краіны гэта барацьба за добрыя ўзаемакарысныя адносіны ў межах дэмакратычнага выбару гістарычнага шляху развіцця.

***Віды*** міжнародных адносін. Міжнародныя адносіны носяць аб'ектыўны характар. У адпаведнасці з гэтым вылучаюць наступныя віды міжнародных адносін, кожны з якіх мае сваю структуру, функцыі і працэс развіцця:

Палітычныя – гарантуюць бяспеку і ствараюць ўмовы для развіцця іншых адносін, знаходзяць сваё адлюстраванне ў рэальнай палітычнай дзейнасці элементаў палітычнай сістэмы, перадусім дзяржавы.

Эканамічныя і навукова-тэхнічныя – накіраваны на абарону эканамічных інтарэсаў, якія ўплываюць на фарміраванне сусветнага рынку, міжнародны падзел працы. Стан эканамічных адносін шмат у чым вызначаецца ўзроўнем развіцця вытворчасці і вытворчых сіл дзяржаў, рознымі мадэлямі эканомікі, наяўнасцю прыродных рэсурсаў і інш.

Ідэалагічныя адносіны.

Міжнародна-прававыя адносіны рэгулiруюць узаемаадносіны ўдзельнікаў міжнароданага яднання прававымі нормамі і правіламі, аб якіх гэтыя ўдзельнікі дамовіліся. Міжнародна-прававы механізм дазваляе ўдзельнікам абараняць свае інтарэсы, развіваць узаемаадносіны, папярэджваць канфлікты, вырашаць спрэчкі, падтрымліваць мір і бяспеку ў інтарэсах усіх народаў. Адносіны маюць універсальны характар, грунтуюцца на сістэме агульнапрызнанных прынцыпаў. Аднак, акрамя таго існуюць спецыяфічныя нормы, якія рэгулiруюць спецыяльныя накірункі: дыпламатычнае права, марское гандлёвае права, міжнародны арбітраж, суд і інш.

Ваенна-стратэгічныя – гэта сфера спецыфічных грамадскіх, міжнародных адносін, якія звязаны так ці інакш з прамым ці апасродкавым стварэннем, назапашваннем, пераразмеркаваннем ваеннай сілы.

Культурныя адносіны, у іх аснове знаходзяцца працэсы інтэрнацыяналізацыі грамадскага жыцця, узаемапранікнення і абагачэння культур, сістэм адукацыі, развіцця сродкаў масавай інфармцыі. Асноўнае значэнне ў іх развіцці маюць няўрадавыя ўстановы.

Усе віды міжнародных адносін існуюць у розных ***формах***, якія шматвобразныя:

- палітычныя: прававыя, дыпламатычныя, арганізацыйныя і г.д.;
- эканамічныя: фінансавыя, гандлёвыя, каапературыўныя і г.д.;
- ідэалагічныя: пагадненні, дэкларацыі, дыверсіі, псіхалагічная вайна і г.д.;
- ваенна-стратэгічныя: блокі, саюзы і інш.;
- культурныя: гастролі артыстаў, абмен інфармацыяй, выставы і г.д.;

Сістэма міжнародных адносін знаходзіцца ўвесь час у развіцці і ўдасканаленні, з'уляюцца новыя віды, узроўні адносін, іх формы атрымліваюць новы змест.

Як падкрэслівае С. Рашэтнікаў, міжнародныя адносіны ахопліваюць вельмі шырокую, а таму цяжкую для разумення вобласць з'яў і працэсаў, грунтоўнае разуменне якіх, тэарэтычнае ўпарадкаванне і аналіз іх узаемасувязей, пры сённяшнім стане ведаў і недасканаласці навуковага апарата амаль немагчымае.

У міжнародным жыцці, у адрозненні ад іншых праяў грамадскага жыцця, няма аднаго цэнтра ўлады і кіравання, у наяўнасці – поліцэнтрызм і поліерархія, у межах якой вельмі вялікую ролю адыгрываюць стыхійныя працэсы і суб'ектыўныя фактары. Заканамернасці і паўторнасць амаль не заўважаюцца.

У даследчыка міжнародных адносін няма магчымасці цалкам атрымаць неабходную і аб'ектыўную інфармацыю, асабліва ў сферы палітычнай і стратэгічнай, у якіх вялікую ролю адыгрываюць меркаванні бяспекі і таямніцы дыпламатыі.

У сферы дзеянняў фактараў (дзейнікаў) міжнародных адносін вельмі вялікую ролю адыгрываюць адначасовасць вялікай колькасці ўзаемадзеянняў і выпадковыя падзеі. Гэта ўсё разам перашкаджае аналізу і ацэнцы мэтавых дзеянняў і прадбачанне іх наступстваў.

## 3. Інстытуалізацыя міжнародных палітычных адносін

Сродкам палітычнага рэгулявання міжнародных адносін з'яўляюцца міжнародныя арганізацыі, ад якіх таксама залежыць развіццё міжнародных адносін, практычная рэалізацыя знешняй палітыкі.

**Міжнародныя арганізацыі** – трывалыя аб'яднанні міжурадавага і няўрадавага характару, якія ствараюцца на аснове міжнароднага пагаднення (статута, канстытуцыйнага дакумента) у мэтах садзейнічання рашэнню міжнародных праблем.

Першыя міжнародныя арганізацыі з'явіліся толькі ў 19 ст. Асабліва хутка яны пачалі ствараца пасля Другой сусветнай вайны. У сучасных умовах іх вельмі шмат.

Міжнародныя арганізацыі падзяляюцца на:

– ***міжурадавыя***, якія ствараюцца на аснове шматбаковых міжнародных дамоў і аб'ядноўваюць дзяржавы: ААН, еўрапейскі звяз, арганізацыя амерыканскіх дзяржаў, арганізацыя краін экспартораў нафты, арганізацыя афрыканскага адзінства, арганізацыя "ісламская канферэнцыя", ЮНЭСКА (арганізацыя ААН, якая займаецца праблемамі культуры, адукацыі, навукі), МАГАТЭ (Міжнароднае агенцтва ААН па атамнай энергіі), ЮНЭП (арганізацыя ААН, якая займаецца распрацоўкай мераў па ахове навакольнага асяроддзя);

– ***няўрадавыя***, у склад якіх уваходзяць нацыянальныя грамадскія аб'яднанні (Сусветная федэрацыя прафсаюзаў, Сацінтэрн), прыватныя асобы (Рада Пагуошскага руху), гарады (Сусветная федэрацыя гарадоў – пабрацімаў),

навуковыя ўстановы (Міжнародная рада навуковых саюзаў) і іншыя аб'яднанні.

Падзяляюцца міжнародныя арганізацыі таксама на сусветныя і рэгіянальныя.

Вялікую ролю адыгрываюць транснацыянальныя карпарацыі (ТНК). Існуе каля 600 карпарацый міліярдзераў. Сярод іх: МАГІ – шматбаковае агенцтва па гарантыям інвестыцый, МАСК – міжнародная асацыяцыя па страхаванню крэдытаў і інш.

Самая вядомая міжнародная арганізацыя – **ААН** (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый), якая на сёння з'яўляецца галоўным суб'ектам міжнародных адносін. ААН была створана 24.10.1945 года, сярод краін заснавальнікаў была і ёсць Беларусь. У склад ААН уваходзяць 184 дзяржавы (2004 год). Дзейнічаюць шэсць галоўных органаў ААН: Генеральная асамблея, Савет бяспекі, Эканамічная і сацыяльная рада, Рада па апякунству, Міжнародны суд, Сакратарыят.

***Мэты ААН***:

- падтрымліваць сусветны мір і бяспеку;
- развіваць сяброўскія сувязі паміж нацыямі на аснове раўнапраўя і самавызначэння;
- рэалізоўваць міжнароднае супрацоўніцтва на аснове павагі к правам чалавека і свабоды;
- з'яўляцца цэнтрам для ўзгаднення дзеянняў нацый у дасягненні гэтых мэтаў.

Міжнародныя арганізацыі з'яўляюцца вельмі ўплывовымі суб'ектамі міжнародных адносін і аказваюць у апошні час усё большы ўплыў на сустветны палітычны працэс.

## 4. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці міжнародных адносін сучаснасці

Перадусім неабходна разгледзець прынцыпы міжнародных адносін, якія зафіксавалі ў Статуце ААН і іншых дакументах, ратыфікаваных большасцю краін свету.

Галоўнымі ***прынцыпамі*** міжнародных адносін з'яўляюцца:

1) Няўмяшальніцтва, згодна якому не дазваляецца прамое ці ўскоснае ўмяшальніцтва дзяржаў ці міжнародных арганізацый ва ўнутраныя справы іншых краін і народаў.

2) Прынцып мірнага вырашэння міжнародных спрэчак і канфліктаў праз перамовы, пасрэдніцтва, разбіральніцтва ў судзе, міжнародным арбітражы і г.д.

3) Прынцып мірнага суіснавання дзяржаў з розным грамадскім ладам – непарушнасць тэрыторыі дзяржаў, усебаковае супрацоўніцтва, адмова ад прымянення моцы з мэтай парушэння палітычнай незалежнасці іншай краіны.

4) Прынцып раўнапраўя і самавызначэння народаў, прынцып суверэннай роўнасці дзяржаў, які выключае ўсялякую замежную ўладу на тэрыторыі іншай дзяржавы. Суверэнітэт зя'ўляецца неад'емным правам дзяржавы.

5) Прынцып поўнага выконвання праў чалавека і асноўных свабод, пад якімі разумеецца комплекс сацыяльна-эканамічных, грамадзянскіх, палітычных, культурных праў і свабод, якія характарызуюць статус асобы ў дзяржаве (Статут ААН, Усеагульная дэкларацыя праў чалавека 1948 года і інш.).

6) Прынцып безумоўнага ўстрымання ад прапаганды гвалту, тэрора і вайны, як сродкаў сусветнай палітыкі.

7) Прынцып добрасумленнага выканання дзяржавамі абавязацельстваў, якія яны ўсклалі на сябе самі.

Для разумення складаных з'яў сучаснага палітычнага жыцця ў сферы міжнародных адносін неабходны аналіз тэндэнцый развіцця сусветнай палітыкі. Улік асноўных тэндэнцый неабходны пры разглядзе не толькі міжнародных, але і нацыянальных палітычных праблем.

Як адзначае Я.Сапёлкін, адным з асноўных ***накірункаў*** сучаснага палітычнага развіцця з'яўляецца ***пераўтварэнне міжнародных адносін у сапраўды сусветныя адносіны***. Сучасны свет сёння прадстаўлены не толькі "вялікімі дзяржавмі", але і больш чым за 200 дзяржавамі. Усе яны з'яўляюцца суб'ектамі міжнародных адносін і сусветнай палітыкі, нейкім чынам уплываюць на палітычныя працэсы ў свеце.

У сувязі з гэтым ускладніліся міжнародныя адносіны, што адлюстроўвае яшчэ адну тэндэнцыю сучаснага развіцця. У наш час актыўны ўдзел у палітычным жыцці дзяржаў, якія знаходзяцца на розных узроўнях сацыяльна-эканамічнага і культуранага развіцця і, маючыя ўласную гісторыю і нацыянальны вопыт, розныя тыпы палітычнага ладу, нараджае новыя міжнародныя праблемы і супярэчнасці. Таму ўзрастае роля міжнародных арганізацый у сучаснай палітыцы. Яны павінны каардзініраваць дзейнасць нацыянальных дзяржаў, якія выступаюць як суб'екты палітыкі. Ускладненне палітычных міжнародных адносін выклікана і разбурэннем двухполюснага міру (існаванне дзвюх "зверхдязржаў" і дзвюх ваенна-палітычных блокаў) і фарміраваннем новай міжнароднай палітычнай структуры.

Наступны ***накірунак***, альбо тэндэнцыя ў развіцці міжнародных адносін – ***узрастанне інтэграцыйных працэсаў у свеце пры адначасовым развіцці нацыянальнай самасвядомасці народаў***. Гэта вельмі супярэчлівая тэндэнцыя. З аднаго боку імкненне да інтэрнацыяналізацыі на грунце эканамічнага збліжэння краін і народаў. З другога – нацыянальныя і нацыяналістычныя памкненні розных народаў. Апошняе нават атрымала паняцце "нацыянальнага рэнесансу" як з'явы сусветнага парадку. Гэта добра бачна на прыкладзе Еўропы.

Наступныя ***тэндэнцыі*** развіцця сучасных міжнародных адносін – ***гуманізацыя і дэмакратызацыя***. Міжнародныя адносіны садзейнічаюць стварэнню магчымасцей і ўмоў для развіцця і ўдасканалення асобы, павышэння дабрабыту чалавека і якасці яго жыцця. Адбываецца пераход ад канфрантацыйнай раўнавагі (заснаванай на ваенна-палітычным парытэце дзвюх сістэм) да новага сусветнага парадку (стварэнне інтэграцыйных саюзаў, сумеснае вырашэнне глабальных праблем і г.д.).

Яшчэ адным ***накірункам*** развіцця сучаснага свету з'яўляецца ***высоўванне ў цэнтр сусветнай палітыкі і міжнародных адносін глабальных праблем***. Да выразных рыс апошніх варта аднесці комплекснасць, сістэмнасць і ўсеагульны характар. У іх адлюстравана адзінства сучаснага свету, узмацненне ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці ўсіх элементаў чалавечай супольнасці, у прыватнасці, існуючых сусветных палітычных структур.

Міжнародны палітычны парадак – гэта пэўны якасны стан сістэмы міжнародных адносін на тым ці іншым этапе яе развіцця. Ён мінае розныя па зместу і па характару этапы.

## ЛЕКЦЫЯ 17. СУСВЕТНАЯ ПАЛІТЫКА І ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАСЦІ. ГЕАПАЛІТЫКА

1. Узнікненне, сутнасць і дынаміка глабальных праблем сучаснасці.
2. Шляхі рашэння глабальных праблем сучаснасці.
3. Сутнасць, асноўныя элементы і фактары геапалітыкі.
4. Геапалітычныя наступствы распаду СССР. Беларусь на геапалітычным скрыжаванні.

### 1. Узнікненне, сутнасць і дынаміка глабальных праблем сучаснасці.

Тэрмін "глабальныя праблемы" ў навуковай літаратуры ўжываецца з канца 1960-х гадоў. Але глабальныя праблемы ўзніклі значна раней. Грамадства добра ведае пра існаванне глабальных праблем. Палітыкі вельмі часта гавораць аб іх. У той жа час любы чалавек адразу можа сфармуліраваць дзве – тры, не болей. У першую чаргу – гэта глабальная экалагічная праблема і пагроза ракетна-ядзернай зброі ў вырашэнні існуючых міжнародных канфліктаў. Таму існуе пільная патрэба сфармуліраваць рысы глабальных праблем, прычыны абвастрэння іх на сучасным этапе развіцця чалавечай супольнасці, вызначыць тыпы і магчымыя шляхі вырашэння. Галоўнымі крытэрыямі глабальнасці праблем з'яўляюцца: прасторавае і планамернае вымярэнне, а таксама змест, які ўтрымлівае пытанні захавання цывілізацыі. Зыходзячы з гэтага можна сфармуліраваць абагульненае паняцце глабальных праблем.

**Глабальныя праблемы сучаснасці** – гэта праблемы, якія стрымліваюць грамадскі прагрэс чалавецтва, а пры пэўных умовах ставяць пад сумленне існаванне нашай цывілізацыі.

На падставе гэтага паняцця палітолаг Г. Круглова сфармуліравала найбольш характэрныя ***рысы*** глабальных праблем:

а) маюць агульначалавечы характар, бо яны закранаюць інтарэсы ўсіх краін і народаў, а ў перспектыве – будучае ўсяго чалавецтва;

б) спадарожнічаюць чалавечаму грамадству на працягу ўсёй гісторыі, нягледзячы на тое, што да пэўнага этапа свайго развіцця яны не выяўляюць сваёй вастрыні, нават іх развіццё не заўжды прыкметнае;

в) у сучасных умовах набываюць сусветны характар, бо сферай іх дзеянняў стала ўся планета;

г) маюць комплексны, сістэмны характар, каб іх вырашыць, неабходны сумесныя намаганні ўсіх краін і народаў;

д) развіваюцца ў часе і прасторы, у выніку з'яўляюцца новыя, а пэўныя знікаюць;

е) супярэчлівыя з пункту гледжання свайго рашэння, так як цалкам глабальныя запатрабаванні будуць задаволены ў далёкай гістарычнай перспектыве, а ў сучасных умовах яны атрымліваюць частковае, прамежкавае рашэнне, пры ўмовах актыўнага міжнароднага супрацоўніцтва;

ж) маюць змешаную сацыяпрыродную сутнасць і па прычынах узнікнення і па характару праяў.

Глабальныя праблемы ўяўляюць з сябе сукупнасць сацыяпрыродных праблем, ад рашэння якіх залежыць сацыяльны прагрэс чалавецтва і захаванне цывілізацыі. Гэта праблемы, якія характарызуюцца дынамізмам, узнікаюць як аб'ектыўны фактар развіцця грамадства і для свайго рашэння патрабуюць аб'яднаных намаганняў усяго чалавецтва.

Глабальныя праблемы сучаснасці не з'яўляюцца чымсьці новым для чалавецтва, хутчэй за ўсё, яны ўяўляюць з сябе нячутнае абвастрэнне і паглыбленне ў сучасных умовах існаваўшых раней супярэчнасцей у сістэме "чалавек – грамадства – прырода".

***Прычынамі***, якія садзейнічалі іх актуалізацыі, з'яўляюцца:

а) удасканаленне і развіццё вытворчых сіл і вытворчых адносін, вынік развіцця матэрыяльнай культуры грамадства;

б) вынікі сацыяльнага прагрэса;

в) паглыбленне супярэчнасцей, якія вызначаюцца драпежніцкімі адносінамі да чалавека і прыроды – бескантрольнае і інтэнсіўнае выкарыстоўванне прыродных рэсурсаў (карысных выкапняў), узмацненне неспрыяльных наступстваў чалавечай дзейнасці;

г) паскоранае развіццё НТР;

д) супадзенне навукова-тэхнічнай рэвалюцыі з буйнымі сацыяльнымі пераменамі ў свеце (напрыклад, рэвалюцыя ў вайсковай справе і стварэнне зброі масавага знішчэння прывялі да ўзнікнення праблемы захавання і выжывання чалавецтва).

Такім чынам, можна падсумаваць, што асноўнымі прычынамі абвастрэння глабальных праблем у сучасных умовах з'яўляюцца развіццё грамадства, яго вытворчых сіл, нячутнае развіццё НТР і сацыяльны прагрэс.

Усе глабальныя праблемы знаходзяцца ў непарыўнай і ўзаемаабумоўліваючай сувязі паміж сабою. Кожная глабальная праблема не існуе "сама па сабе", а як "элемент" структуры ўсёй сістэмы глабальных праблем. Таму неабходна вызначыць тыпалогію глабальных праблем, зыходзячы з пэўнага крытэрыя. Найбольш поўная тыпалогія прадугледжвае, што праблемы маюць карані ў адносінах паміж асноўнымі сацыяльнымі супольнасцямі, у адносінах паміж чалавекам і прыродай, паміж чалавекам і грамадствам.

Л.Самойлава і Г.Круглова вылучаюць наступныя тыпы глабальных праблем сучаснасці.

***1 клас – суперглабальныя (агульнасусветныя):***

- папярэджанне сусветнай ракетна-ядзернай вайны;
- усталяванне новага міжнароднага парадку на прынцыпах раўнапраўя і супрацоўніцтва;
- развіццё эканамічнай інтэграцыі.

Яны звязаны з перабудовай міжнародных адносін у адпаведнасці з патрабаваннямі далейшага прагрэсу чалавецтва.

***2 клас – агульнапланетарныя (рэсурсныя):***

- экалагічная;
- дэмаграфічная;
- энэргетычная;
- харчовая;
- праблема выкарыстоўвання космаса і інш.

Яны звязаны з праблемамі аптымізацыі, гарманізацыі і гуманізацыі адносін грамадства да прыроды.

***3 клас – агульначалавечыя (субглабальныя):***

- ліквідацыя эксплуатацыі і жабрацтва;
- праблема аховы здароўя і адукацыі;
- гарантыя праў чалавека;
- праблема планіравання і рэгуліравання роста ўзроўню і якасці жыцця і інш.

Гэта праблемы сацыякультурнага, гуманітарнага шэрагу, якія звязаны з дэмакратызацыяй адносін грамадства і асобы.

Неабходна мець на ўвазе, што неад'емнай рысай сучасных глабальных праблем з'яўляецца іх дынамізм. Гэта абумоўлівае магчымасць павелічэння або памяншэння глабальных праблем, а таксама зніжэння або павялічэння вастрыні той ці іншай праблемы. Сістэма праблем не застаецца нязменнай у часе. Яна развіваецца. Таму, натуральна, у пачатку трэцяга тысячагоддзя магчыма перад чалавецтвам паўстане неабходнасць шукаць рашэнне зусім іншай па складу і характару сістэмы глабальных праблем, чым той, з якой чалавецтва сутыкнулася напрыканцы XX стагоддзя.

## 2. Шляхі рашэння глабальных праблем сучаснасці

Вялікае значэнне для паспяховага вырашэння глабальных праблем набывае навуковы разлік і прагноз. Узнікаючы стыхійна, глабальныя праблемы патрабуюць планамерна накіраваных дзеянняў людзей для іх вырашэння. У сучасных умовах гэта прадвызначае прагрэс ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці. Чалавецтва павінна папярэдзіць магчымыя адмоўныя наступствы, якія пагражаюць існаванню і развіццю сённяшняга і будучага пакаленняў. На думку Г.Кругловай, і з гэтым немагчыма не пагадзіцца, для вырашэння глабаль-

ных праблем неабходна ўлічваць навукова-тэхнічныя (або натуральна-прыродныя) і сацыяльна-палітычныя аспекты.

Планетарны характар глабальных праблем прадвызначыў і шырокі дыяпазон падыходаў, думак, тэорый. Сярод гэтага мноства канцэпцый магчыма вылучаць як узаемадапаўняючыя, так і ўзаемаадмаўляючыя адна адну. Стратэгія вырашэння глабальных праблем непазбежна павінна спалучыць у сабе навуковы, сацыяльны і гуманістычны падыходы да гэтых праблем. У праектах ***вырашэння глабальных праблем*** магчыма вылучыць чатыры ***падыходы*** ў залежнасці ад ролі і значэння навукова-тэхнічнага прагрэса (НТП):

1) канцэпцыі, якія бачаць вырашэнне глабальных праблем толькі ў дасягненнях НТР, зусім не ўлічваючы іх сацыяльнай накіраванасці;

2) канцэпцыі, якія цалкам адмаўляюць дасягненні НТП, заклікаюць да прыпынення росту вытворчасці і прыпынення дзейнасці, накіраванай на развіццё навукі, тэхнікі, пераўтварэнняў прыроды і г.д.

3) канцэпцыі, якія ігнаруюць НТП у звязку з вырашэннем глабальных праблем, але не адмаўляюць яго ў грамадстве; асноўны ціск робіцца на змяненні духоўнага жыцця чалавека;

4) канцэпцыі, якія бачаць вырашэнні глабальных праблем шляхам спалучэння дасягненняў навукова-тэхнічнага і сацыяльнага прагрэса грамадства.

Адразу неабходна падкрэсліць, што побач з сацыяльна-эканамічным пераўладкаваннем грамадства, у наш час усё большую значнасць набывае фарміраванне новай глабальнай свядомасці. Пад уплывам навуковай думкі і працы стыхійныя формы ўзаемадзеяння чалавека з прыродай павінны саступіць месца арганізаваным у адпаведнасці з законамі функцыяніравання і развіцця біясферы. Уладарства тэхнічных і біялагічных законаў узаемадзеяння грамадства і прыроды заменяць сацыяльныя (разумныя) законы. У гэтым кантэксце вялікую ролю мае развіццё міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, сумеснае змаганне з забруджваннем навакольнага прыроднага асяроддзя, сумесныя навуковыя даследаванні.

Кажучы пра глабальныя праблемы і іх вырашэнні неабходна адзначыць сацыяльна-палітычныя аспекты. Вырашэнне праблем немагчыма без усвядомленай і мэтанакіраванай дзейнасці чалавека. Іх глабальны характар патрабуе для вырашэння сумесных намаганняў усіх краін і народаў свету. Гэта дае падставу для сацыяльна-палітычных аспектаў міжнароднага супрацоўніцтва ў вырашэнні глабальных праблем сучаснасці. Але шмат залежыць ад падыходаў да гэтых праблем у палітыцы асобна ўзятых краін.

Знаходзячыся ў сувязі з сацыяльнымі, эканамічнымі, палітычнымі супярэчнасцямі сучаснага свету, глабальныя праблемы непазбежна выклікаюць сутыкненне інтарэсаў розных класаў, сацыяльных груп, палітычных партый, грамадскіх рухаў і г.д. Яны набываюць палітычную афарбоўку, іх вырашэнне знаходзіцца ў сферы палітыкі. У пэўнай ступені, глабалістыка з'яўляецца той вобласцю, дзе сутыкаюцца палітычныя курсы і мэты розных дзяржаў, партый, рухаў, класаў.

Шматлікія партыі, рухі і арганізацыі, якія зацікаўлены ў вырашэнні глабальных праблем, распрацоўваюць свае палітычныя дактрыны, вылучаюць уласныя праграмы вырашэння гэтых праблем. Аднак неабходна заўжды памятаць, што ўсё чалавецтва хвалююць глабальныя праблемы і яно заклапочана неабходнасцю іх вырашэння, аднак шляхі і сродкі іх вырашэння розныя, у залежнасці ад палітычных і ідэалагічных інтарэсаў.

Безумоўна, што па сваёй сутнасці глабальныя праблемы маюць біясацыяльны характар. Адзначаючы значнасць натуральна-прыроднага боку, трэба прызнаць галоўнымі ў вырашэнні праблем сацыяльна-палітычныя змены. Навуковыя веды дазваляюць сёння прапанаваць тэхнічнае забеспячэнне вырашэння любых самых складаных глабальных праблем, з якімі сутыкнулася чалавецтва. Але практычная рэалізацыя такіх праектаў залежыць передусім ад рэальнага палітычнага курса, ад сацыяльна-палітычных умоў, ад мэтаў дзяржавы ці палітычнай партыі. Глабалістыка стала не толькі спецыяльнай галіной навуковых ведаў, але і накірункам дзяржаўнай палітыкі. На сёння можна казаць аб глабальным мадэліраванні развіцця, як неад'емнай часткі палітыкі ўсіх дзяржаў. Неабходна памятаць, што галоўнае – гэта не лозунгі і дэкларацыі, а практычная рэалізацыя. А вось тут узнікаюць складанасці. Нават дасягнуўшы згоды па асноўных мэтах і задачах, розныя палітычныя сілы на практыцы не заўжды імкнуцца да іх рэалізацыі. Найбольш яскрава бачны розныя падыходы і сувязь палітыкі і глабальных праблем на прыкладзе вырашэння праблемы вайны і міра (палітычныя, канцэпцыя "ядзернага міра" і г.д.), экалагічных праблем і інш.

У сучасных умовах магчыма весці размову аб шчыльнай узаемасувязі палітыкі з субглабальнымі праблемамі. Ад вырашэння гэтых праблем на сённяшні дзень не залежыць выжыванне чалавецтва. Але яны вызначаюць "якасць жыцця" грамадства. Праблемы адукацыі, культуры, нацыянальна-этнічныя, развіцця сродкаў масавай камунікацыі залежаць шмат у чым ад палітычнага курса краіны. Праблема гарантыі правоў чалавека, перадусім права на жыццё, забяспечваецца, ў першую чаргу, палітычным вырашэннем на дзяржаўным і міжнародным узроўнях.

Наогул, агульначалавечыя аспекты глабальных праблем прадвызначылі іх шчыльную сувязь з міжнароднай палітыкай. Практычна ўсе краіны (за выключэннем Ірана, Паўночнай Карэі і падобных) усвядомілі неабходнасць міжнароднага супрацоўніцтва ў іх вырашэнні.

Для паспяховага пераадолення ўсіх глабальных праблем неабходна прадуманная, узважаная палітыка ўсіх дзяржаў па развіццю міжнароднага супрацоўніцтва і іх актыўная дзейнасць па практычнай рэалізацыі ўсіх праграм. Ці інакш кажучы, вырашэнне іх магчыма толькі пры спалучэнні нацыянальных намаганняў з дзейнасцю эфектыўнай сістэмы міжнароднага супрацоўніцтва.

### 3.Сутнасць, асноўныя элементы і фактары геапалітыкі

Ад даўніх часоў людзі імкнуліся патлумачыць залежнасць свайго лёсу ад таго месца, дзе жывуць і здабываюць сабе ежу.

Тэрмін "геапалітыка" з'явіўся ў 1916 годзе. Упершыню яго ў навуцы ўжыў шведскі прафесар Рудольф Чэллен. Паходзіць ад спалучэння двух грэчаскіх моў: ge – Зямля + politike – палітыка.

**Геапалітыка** – гэта вучэнне аб геаграфічнай абумоўленасці палітычных з'яў, асаблівая галіна ведаў, якая вывучае сувязь паміж зямлёй, геаграфічным асяроддзем і палітыкай дзяржаў.

Геапалітыка з'яўляецца адным з тэарэтычных абгрунтаванняў палітыкі дзяржавы як унутры краіны, так і на міжнароднай арэне. Напрыклад, у пачатку ХХ ст. моц і ўплыў дзяржаў непасрэдна залежылі ад геаграфічнага палажэння краіны, колькасці яе насельніцтва, яе карысных выкапняў і г.д.

Геапалітыка – сродак прыцягнення ўвагі палітыкаў да ролі геаграфічных фактараў у канцэпцыі дзяржавы і ў мастацтве кіравання. Геапалітыка разглядае дзяржаву як геаграфічны арганізм і разам з тым палітычную прастору. Інакш кажучы, дзяржава – гэта зямля, тэрыторыя, асяродак жыцця, насельніцтва і адначасова – краіна. Геаграфічны арганізм – гэта рэльеф, клімат, глеба, вада, раслінны і жывёльны свет. Ад уласцівасцей ландшафтаў і рэльефа шмат у чым залежыць своеасаблівасць жыцця людзей ў пэўным рэгіёне, гандлёвыя адносіны і ў рэшце рэшт расклад палітычных сіл. Важнае ваенна-палітычнае і эканамічнае значэнне маюць шляхі (дарогі): зносін і гандлёвыя. Так, напрыклад, тое, што беларускія землі знаходзіліся на скрыжаванні вялікіх гандлёвых шляхоў, прывяло да ўзнікнення магутных дзяржаў на беларускай тэрыторыі (Полацкага, Турава-Пінскага княстваў, ВКЛ), на гэтым месцы (вакол рэк Дняпра, Нёмана, Заходняй Дзвіны і інш.) сфарміравалася беларуская нацыя. Адзін з пачынальнікаў геапалітыкі, нямецкі прафесар Ф.Ратцаль распрацаваў тэорыі "жыццёвай прасторы" і "натуральных межаў", згодна якіх геаграфічнае адзінства вядзе да палітычнага.

***Прадмет геапалітыкі*** – актуальныя праблемы нацыянальных інтарэсаў, заканамерная ўзаемасувязь палітыкі; дзейнасці дзяржавы і геаграфічных фактараў жыццёвай прасторы.

***Фактары геапалітыкі (іх сутнасць):***

1) Светапоглядны, рэлігійны і ідэалагічны – гэтыя тры паняцці аб'ядноўваюцца ў адзін фактар. Яны не ідэнтычныя, але блізкія па сваёй сутнасці – кожны з іх уяўляе з сябе пэўную сістэму поглядаў на свет, чалавека, грамадства. Фактар адыгрывае ролю ў сцвярджэнні вобраза, жыцця і аказвае ўплыў на міжнародныя адносіны і знешнюю палітыку.

2) Геаграфічны фактар – адзін з самых галоўных, выражае прадметную сутнасць геапалітыкі, сувязь паміж зямлёй, геаграфічным асяроддзем і палітыкай дзяржавы.

3) Дэмаграфічны фактар – гэта значны людскі рэзерв палітычнай улады любой краіны. Вельмі актуальны сёння, калі ў пэўных краінах ідзе працэс скарачэння насельніцтва, а ў іншых рост – "дэмаграфічны выбух".

4) Ваенна-палітычны фактар – моцны ваенны патэнцыял дзяржавы (саюзу дзяржаў) ва ўмовах НТП дазваляе дыктаваць сваю волю на міжнароднай арэне, дамагацца сваіх палітычных мэтаў.

5) Эканамічны фактар – уплыў дзяржавы грунтуецца на яе эканамічным патэнцыяле.

6) Этна-нацыянальны фактар – этнічныя і нацыянальныя супольнасці краін з'яўляюцца цэласнымі, адносна аўтаномнымі ўтварэннямі са сваімі інтарэсамі, культурай і памкненнямі, таму іх існаванне ўмацоўвае альбо разбурае ўклад суверэнных дзяржаў.

7) Фактар прыродных рэсурсаў і экалогіі. Прыродныя рэсурсы (зямельныя, водныя, энэргарэсурсы, мінеральныя, раслінныя, рэсурсы жывёльнага свету і г.д.) краіны ў цэлым, складаюць умовы жыцця чалавека і грамадства. У сувязі з павелічэннем спажывання рэсурсаў і іх скарачэннем з'яўляюцца сур'ёзныя праблемы, абвастраюцца супярэчнасці паміж дзяржавамі. Выкарыстоўванне рэсурсаў прывяло да экалагічных праблем. Неабходна рацыянальнае выкарыстоўванне прыродных рэсурсаў, усталяванне гарманічнага ўзаемадзеяння грамадства з навакольным асяроддзем, а гэта магчыма дасягнуць толькі намаганнямі ўсяго чалавецтва.

**Асноўнае пытанне геапалітыкі –** вывучэнне палітычнай практыкі дзяржавы, натуральнага асяроддзя жыцця і якасці жыцця свайго народу; адносіны з палітычнымі сіламі суседніх і іншых краін. Вывучэнне яго неабходна каб умацаваць свае палітычныя пазіцыі і сваё права на жыццёвую прастору ў даным рэгіёне, каб мець магчымасць на ўласную ўнутраную і знешнюю суверэнную палітыку, каб своечасова ліквідаваць магчымыя перашкоды на шляху сацыяльна-эканамічнага развіцця сваёй нацыі. Геапалітыка – гэта псіхалогія дзяржавы.

Складовымі ***элементамі (канцэпцыямі)*** геапалітыкі з'яўляюцца:

1) геаграфічны дэтермізм – канцэпцыя, якая імкнецца патлумачыць месца краіны ў сістэме міжнародных адносін, яе знешнепалітычную дзейнасць зыходзячы з асаблівасцей геаграфічнага асяроддзя;

2) канцэпцыя ўтварэння дзяржаўнасці – палітычны лёс краіны залежыць ад часу ўзнікнення дзяржавы. Неабходна памятаць, што дзяржаўнасць Беларусі мае больш чым тысячагадовую гісторыю;

3) палітычная прастора і палітычны час – канцэпцыя зыходзіць з таго, што па-за прасторай і часам не бывае палітычнай дзейнасці; вывучаючы вымярэнні прасторы мы лепш будзем разумець перадумовы палітычных рашэнняў. Прастора з'яўляецца не толькі тэрыторыяй дзяржавы, але і атрыбутам яго палітычнай моцы;

4) канцэпцыя жыццёвай прасторы прадугледжавае, што менавіта ў прасторы людзі знаходзяць сродкі існавання, арэну сваёй дзейнасці і бяспекі. Пытанне аб жыццёвай прасторы ёсць адным з галоўных для любой нацыі;

5) "сфера жыццёвых інтарэсаў" – канцэпцыя аб зямной прасторы, якая неабходна якой-небудзь краіне, як жыццёва неабходны, вельмі важны, стратэгічны ўчастак, аб'ект, установа навукі і кіравання і г.д. Геапалітыка даследуе і сферы ўплыву – тэрыторыі залежных і незалежных краін, якія знаходзяцца пад палітычным ці эканамічным кантролем адной з "вялікіх" дзяржаў;

6) насельніцтва, дэмаграфічныя праблемы – аб'ектам геапалітыкі з'яўляецца насельніцтва краіны, яго адукаванасць, культура, менталітэт, тэмпы росту і г.д. Сёння дэмаграфічныя праблемы (напрыклад, перавышэнне смяротнасці над нараджаемасцю) разглядаюцца як частка геапалітычнай (агульнанацыянальнай) стратэгіі дзяржавы;

7) канцэпцыя нацыянальнай бяспекі – напрыклад, атрымаўшы незалежнасць, Рэспубліка Беларусь трапіла ў сістэму еўрапейскай і сусветнай геапалітыкі. Прыярытэт – зыходзіць з існуючага баланса сіл у свеце, бараніць свае нацыянальныя інтарэсы з улікам нацыянальных інтарэсаў суседзяў. У апошнія дзесяць год арыентацыя Рэспублікі Беларусь, у справе забеспячэння нацыянальнай бяспекі, робіцца на ўнутраныя магчымасці, а таксама на Расію і шэраг Усходне-Азіяцкіх і арабскіх краін, супрацьпастаўляючы інтарэсы Беларусі інтарэсам краін Еўропы і ЗША.

Безумоўна, акрамя гэтых у гэапалітыцы маюцца і іншыя канцэпцыі.

Геапалітыка дапамагае выпрацоўваць стратэгічнае мышленне, якое дазволіць палітыкам, суб'ектам кіравання пазбегнуць валюнтарызма і суб'ектывізма, па-за гістарычнага падыхода пры разуменні і вырашэнні спрэчных пытанняў. Дапаможа выхаваць любоў да зямлі, на якой жыве і працуе чалавек, глыбокую павагу да людзей, з якімі трэба супрацоўнічаць і жыць у сяброўстве, успрымаць свет як адзінае і самае каштоўнае.

## 4. Геапалітычныя наступствы распаду СССР. Беларусь на геапалітычным скрыжаванні

Падзеі, якія адбыліся ў другой палове XX ст., істотна змянілі геапалітычныя рэаліі ў свеце. У шэрагу найбольш прыкметных, на думку палітолага Я. Сапёлкіна, варта адзначыць наступныя:

а) распад сацыялістычнай сістэмы і СССР, у выніку з'явіліся новыя незалежныя дзяржавы, якія аддзялілі Расію ад Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Пагоршыўся стан Расіі і скараціўся яе міжнародны ўплыў;

б) ліквідацыя біпалярнага міру, які быў заснаваны на функцыяніраванні двух цэнтраў моцы (сілы). Адзінай звышдзяржавай засталіся ЗША. У той жа час з'яўляюцца ініцыятывы аб фарміраванні шматпалярнага міру;

в) утварэнне новых суверэнных дзяржаў – з'явілася 15 краін, частка якіх арыентуецца на заходнія краіны, другія не вызначыліся, трэція – на садружнасць з Расіяй;

г) стварэнне СНД, Саюза Расіі і Беларусі – гэта ўмацоўвае супрацоўніцтва краін у эканамічнай, палітычнай, духоўнай і іншых сферах грамадскага жыцця;

д) узмацненне экспансіі ЗША і пашырэнне НАТО, іх імкненне падпарадкаваць свайму ўплыву іншыя краіны свету, што ўскладняе міжнародныя адносіны;

е) актывізацыя азіяцкіх дзяржаў (Кітай, Японія, В'етнам), у якіх назіраецца павышэнне тэмпаў эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця, узрастае міжнародная дзейнасць і знешняя палітыка;

ж) узрастанне ўплыву ісламскіх дзяржаў Бліжняга і Сярэдняга Усходу;

з) сюды таксама варта далучыць праявы міжнароднага тэрарызму.

Геапалітычныя асновы палітыкі беларускай дзяржавы складаюць, на думку С. Парэчынай, комплекс ідэй і ўяўленняў беларускага народа аб прынцыпах правядзення знешняй палітыкі Беларусі, мерах па забеспячэнню нацыянальнай бяспекі, месцы і ролі Беларусі ў міжнародных працэсах.

**Геапалітычныя асновы Рэспублікі Беларусь:**

а) Забеспячэнне ***нацыянальнай бяспекі.*** Гэта магчыма пры эфектыўным функцыяніраванні палітычнай сістэмы дзяржавы: грамадзянскім міру; нацыянальнай згодзе; сацыяльнай стабільнасці; прывядзенні патэнцыялу беларускага войска ў адпаведнасць з новымі рэаліямі геастратэгічных, ваенна-палітычных і сацыяльна-эканамічных абставінаў; забеспячэнні эканамічнай, энэргетычнай, харчовай, сацыяльнай, экалагічнай, інфармацыйнай бяспекі; паляпшэнні дэмаграфічнай сітуацыі.

б) ***Нейтралітэт***, які грунтуецца на наступным: Беларусь не мае якіх-небудзь тэрытарыяльных прэтэнзій да іншых краін і не прызнае падобных прэтэнзій да яе з боку іншых дзяржаў; Беларусь – без'ядзерная зона; Беларусь імкнецца да стварэння нейтральнай дзяржавы і адмаўляецца ад удзелу ў войнах і ваенна-палітычных канфліктах за межамі сваёй тэрыторыі.

в) ***Міжнароднае супрацоўніцтва***, якое арыентавана на: паглыбленне інтэграцыйных працэсаў з Расійскай Федэрацыяй (пры захаванні прынцыпаў суверэннай роўнасці і самастойнасці); інтэграцыя ў межах СНД (адзіная эканамічная прастора і сістэма калектыўнай бяспекі); аднаўленне канструктыўнага дыялогу з Еўропай па пытаннях узаемакарыснага супрацоўніцтва; усталяванне адносін з аб'яднанай Еўропай на прынцыпах узаемаразумення і добрасуседства; Беларусь будзе прысутнічаць ва ўсіх рэгіёнах свету, дзе гэта эканамічна карысна і ў адпаведнасці з яе нацыянальнымі інтарэсамі; паглыбленне супрацоўніцтва з краінамі Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі; прызнанні за ЗША ролі міжнароднага лідара пры ўмовах неўмяшальніцтва ЗША ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь.

З'яўляючыся адной з краін, заснавальніц ААН, Беларусь выступае за павышэнне яе ролі ў вырашэнні міжнародных праблем і ***прыярытэт прынцыпаў міжнароднага права***.

Рэспубліка Беларусь імкнецца да супрацоўніцтва з усімі краінамі свету па пытанннях забеспячэння міжнароднай бяспекі, аховы навакольнага асяроддзя, барацьбы з міжнародным тэрарызмам і арганізаванай злачыннасцю, аказання гуманітарнай дапамогі.

# ЛІТАРАТУРА

## Асноўная


1. Конституция Республики Беларусь 1994 года (с изменениями и дополнениями). – 2 изд. – Минск: Амалфея, 2001. – 48 с.
2. Белякович Н.Н. Политология: Практическое пособие. – Минск: Молодёжное научное общество, 2001. – 248 с.
3. Круглова Г.А. Политология: Учеб. пособие для вузов. – Минск: ЗАО "Веды", 1997. – 260 с.
4. Малянок М.А. Паліталогія: Навучальны дапаможнік. – Магілёў, 1994.
5. Мельник В.А. Политология: Учебник для вузов. – Минск: Вышэйшая школа, 2002. – 523 с.
6. Паліталогія. Асноўны курс. – Мінск: Энцыклапедыкс, 2002. – 680 с.
7. Политология: Курс лекций / В.А.Бобков, И.Н.Браим, А.Н.Егоров и др. – Минск: НКФ "Экоперспектива", 1995. – 319 с.
8. Политология: Учебник для вузов / Под ред. В.А.Бобкова. – Минск: Интерпрессервис, 2003. – 352 с.
9. Политология: Учебник для вузов / Под ред. С.В.Решетникова. – Минск: ТетраСистемс, 2000. – 448 с.
10. Политология: Учебно-методический комплекс для студентов и преподавателей высших учебных заведений / Под общ. ред. Е.М.Бабосова, Е.П.Сапёлкина. – Минск: УП "Технопринт", 2002. – 464 с.
11. Решетников С.В. Политология: курс лекций / Решетников С.В., Подкопаев В.В – . 2-е издание – Минск: Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2005. – 328 с.
12. Уінтэр Гэрбэт Р. Канфлікт і кампраміс: Уводзіны ў палітычную навуку / Уінтэр Гэрбэт Р., Бэлоўз Томас Дж., Навук.рэд. В. Маруцік; Пер. з анг. В.Маруціка. – Мінск: Тэхналогія, 2002. – 507 с.


## Дадатковая


1. Агеев А.Г., Пушкин И.А. История профсоюзного движения Могилёвщины. – Могилёв: УПКП “Могилёвская областная укрупнённая типография имени Спиридона Собаля”, 2005. - 216 с.
2. Бондарь П.И. Тесты по политологии: Учеб. пособие для вузов. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2001. – 175 с.
3. Дэбаш Ш., Пант'е Ж.-М. Уводзіны ў палітыку. – Мінск: ЭўроФорум, Беларускі Фонд Сораса, 1996. – 624 с.
4. Зеркин Д.П. Основы политологии: Курс лекций. – Ростов-на-Дону: Феникс, 1999. – 576с.
5. Канашевич Н.М. Политика. Идеология. Менталитет: Курс лекций. – Могилёв: МГУ им. А.А. Кулешова, 2003. – 128 с.
6. Кривогуз И.М. Политология: Учебник для вузов. – М.: Гуманит. издательский центр, 1999. – 288 с.

7. Мельник В.А. Современный словарь по политологии. – Минск: Книжный Дом, 2004. – 640 с.
8. Панарин А.С. Философия политики. Учебное пособие. – М.: Новая школа, 1996. – 424 с.
9. Паречина С.Г. Концептуальные основы идеологии белорусского государства: Методическое пособие. – 2-е изд., доп. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2005. – 58 с.
10. Политология: Конспект лекций. – М.: Приориздат, 2004. – 160 с.
11. Политолоия: Учебник / Под ред. В.А.Ачкасова, В.А.Гуторова. – М.: Юрайт-Издат, 2005. – 692 с.
12. Политология: Учебник для вузов / Под ред. М.А.Василика. – М.: Юристь, 1999. – 600 с.
13. Пугачёв В.П., Соловьёв А.И. Введение в политологию. – М.: Аспект Пресс, 1997. – 447 с.
14. Сморгунов Л.В. Современная сравнительная политология. Учебник. – М.: «Российская политическая энциклопедия» (РОССПЭН), 2002. – 472с.
15. Тавадов Г.Т. Политология: Учебное пособие для вузов. – М.: ФАИР-ПРЕСС, 2000. – 416 с.
16. Штайнер Ю. Еўрапейскія дэмакратыі / Навук.рэд. Л.Чарнышова. – Мінск.: Беларускі фонд Сораса; Лекцыя, 1996. – 343 с.

Вучэбнае выданне

**ПАЛІТАЛОГІЯ**

Курс лекцый

Складальнікі
**Бубнаў** Юры Міхайлавіч
**Пушкін** Ігар Аляксандравіч

Рэдактар Т. Л. Бажанава
Тэхнічны рэдактар А. А. Шчарбакова

Падпісана да друку 31.07.2006 г. Фармат 60x84 1/6
Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Друк трафарэтны.
Умоўн. друк. л.10,2. Ул.-выд. л. 11
Тыраж 60 асоб. Заказ 112

Установа адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання”
212027, Магілёў, пр-т Шмідта, 3.
ЛВ № 604 от 03.06.2003г.

Надрукавана на рызографе рэдакцыйна-выдавецкага аддзелу
установы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання”
212027, Магілёў, пр-кт Шмідта, 3.
ЛП № 226 ад 12.02.2003г.